

СПАЛЕНЫЯ ВЁСКІ ГРОДЗЕНСКАГА РАЁНА

8-9

ІВАН ПТАШНІКАЎ ЯК ПІСЬМЕННІК І ЧАЛАВЕК

13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

8 КАСТРЫЧНІКА 2022 г. СУБОТА № 198 (29820)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Максім РЫЖАНКОЎ, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Рост інфляцыі ў многім звязаны са знешнімі ўмовамі. Але мы разумеем, што можам навесці парадак тут, і павінны гэтым займацца.*

*У першую чаргу агульнае рэгуляванне — задача ўрада, гэта агульны кантроль спецыяльных службаў. Але і на месцах кіраўніцтва абласцей і раёнаў павінна бачыць гэтыя праблемы.*

*Павінны са сваімі спецыялістамі прайсціся па ўсіх гандлёвых кропках, крамах, вывучыць цэны, паразмаўляць з людзьмі. Таксама прынцыповая размова павінна быць і з гандлёвымі сеткамі. Нагадаю, калі яны заходзілі ў вобласці і райцэнтры, гаварылі аб тым, што будзе зніжэнне цаны, лепшыя ўмовы для пакупнікоў, шырокі асартымент. Але з часам прыйшлі да таго, што, заняўшы нішы, пачалі дыктаваць свае ўмовы. Так быць не павінна. Цэнавы фактар павінен рэгулявацца не за кошт спажыўца, а за кошт зніжэння выдаткаў, аптымізацыі працэсаў і дзесьці за кошт завышаных зарплат топ-менеджараў».*

# РОСТ ЦЭН — НЕДАПУШЧАЛЬНЫ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка па выніках нарады аб цэнавай сітуацыі ў краіне 6 кастрычніка падпісаў Дырэктыву № 10 «Аб недапушчальнасці росту цэн»**

**У час нарады напярэдадні былі ўзняты найбольш вострыя пытанні, якія датычацца інфляцыі і росту цэн. Аляксандр Лукашэнка выказаў жорсткую крытыку ў адрас адказных асоб за недастатковы кантроль і актыўнасць у гэтай сферы, каб забяспечыць справядлівае цэнаўтварэнне ва ўсіх сегментах рынку па шырокім спектры прадукцыі. Сітуацыя ў выніку запатрабавала ўмяшання кіраўніка дзяржавы.**

**Па выніках нарады Прэзідэнт агучыў сваё рашэнне: «З 6 числа (кастрычніка. — «Зв.») забараняецца ўсякі рост цэн. За-ба-ра-ня-ец-ца! З сённяшняга дня. Не з заўтрашняга дня, а з сённяшняга. Каб за суткі не накруцілі цэны. Таму з сённяшняга дня рост цэн забараняецца. І не дай бог, нехта па бухгалтэрыі правядзе заднім чыслом нешта, нейкія разлікі, пераразлікі».**



Фота БелТА.

### Чаму спатрэбілася прыняцце дырэктывы?

Яшчэ ў час нарады Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, чаму прымае такое валявое рашэнне: «Таму што цэны пасля ўсплёску ашалелага, пра што гаварыў прэм'ер, яшчэ выраслі на столькі ж. І цэны сёння вельмі высокія. Яны ўперліся ў паталок. Далей цэны павышаць нідзе нельга. Няма неабходнасці. Але бываюць выключэнні. І гэтыя выключэнні пад кантролем міністра і губернатараў. Усё».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што не баіцца крытыкі ў сувязі з агучанымі рашэннямі, паколькі самае важнае — праводзіць справядлівую палітыку. «Я публічна стаўлю перад вамі задачу, беручы на сябе, зноў гружу гэта пытанне, ведаючы, што заўтра ўсе захлынуцца, крытыкуючы Прэзідэнта. Але мы павінны праводзіць справядлівую палітыку, — сказаў ён. — Перакана́ўча вас прашу прыняць да 20 кастрычніка пастанову, якая забяспечыць кантроль за цэнаўтварэннем. І, самае галоўнае, недапушчэнне росту цэн. Работа цяжкая і вялікая».

СТАР. 2

## КОРАТКА

- **У аптэках «Белфармацыі» з'явіўся прэпарат, распрацаваны кампаніяй «Фармасінтэз», — таблеткі «Мірабівір» для лячэння цяжкай формы COVID-19.**
- Фізасобы ў Беларусі ў студзені—верасні прадалі на $384 млн валюты больш, чым купілі.

ISSN 1990 — 763X

Акцэнты

# ПРА ВЫКЛІКІ, ПАГРОЗЫ І ГАТОЎНАСЦЬ ІМ СУПРАЦЬСТАЯЦЬ

**Прэзідэнт краіны пасля нарад з ваенным і эканамічным блокамі ўрада даў даручэнне данесці інфармацыю пра бягучую ваенна-палітычную і сацыяльна-эканамічную абстаноўку да грамадскасці. У выніку аператыўна ў сталічным Доме афіцэраў адбыліся дзве сустрэчы. Першая з іх — брыфінг для прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый, экспертнай супольнасці, лідараў буйных грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый, блогераў і сродкаў масавай інфармацыі. Яе мадэратарам выступіў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар ЛУЦКІ, які адзначыў неабходнасць аператыўна інфармаваць грамадскасць па названых пытаннях кіраўніцтвам Міністэрства абароны, Дзяржпагранкамітэта, Камітэта дзяржаўнай бяспекі і Міністэрства эканомікі. Другая сустрэча адбылася ўчора з прадстаўнікамі сілавых ведамстваў. Акрамя кіраўніцтва сілавога блока, перад прысутнымі выступіў прэм'ер-міністр краіны Раман Галоўчанка. Як адзначыў мадэратар гэтай сустрэчы, дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ, аб'ектыўную інфармацыю варта даносіць да калектываў, і такія сустрэчы з кіраўнікамі сілавых ведамстваў і эканамічнага блока ўрада будуць праходзіць і далей — на наступным тыдні яны сустрэнуцца з калектывамі буйных прадпрыемстваў.**

**Асноўныя вытрымкі з выступленняў спікераў сустрэч па пытаннях прыгранічнай, ваеннай і эканамічнай бяспекі прыводзім у нашым матэрыяле.**

СТАР. 3

# З падарункамі і меркаваннямі

**Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у нефармальным саміце кіраўнікоў дзяржаў СНД**

Сустрэча праходзіла ў Канстанцінаўскім палацы ў Санкт-Пецярбургу.

Пасля прыбыцця на саміт Аляксандр Лукашэнка адказаў на пытанні прадстаўнікоў СМІ.

Журналісты спыталі, якое выйсце бачыць беларускі лідар з існуючай міжнароднай абстаноўкі. «А навошта нам выходзіць з нейкай міжнароднай абстаноўкі? — парыраваў Аляксандр Лукашэнка. — З міжнароднай абстаноўкі выйсце павінны шукаць не мы. Мы туды не ўваходзілі і выходзіць адтуль не збіраемся з нейкімі патугамі. А яны няхай шукаюць з гэтай міжнароднай абстаноўкі (выйсце. — **«Зв.»**), куды яны зайшлі».

Прэзідэнт звярнуў увагу, што журналісты не валодаюць усімі звесткамі аб тым, што адбываецца. «Яны шукаюць гэта выйсце ўжо даўно», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Адно з пытанняў Прэзідэнту датычылася бяспекі заходніх граніц Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі ў існуючай міжнароднай абстаноўцы.

«Вы ж чулі заявы, што нібыта ўжо дамовіліся яны: арсеналы ядзернай зброі перамесцім у Польшчу, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Будзем думаць. Мы ўжо вырашылі, яшчэ раз падумаем, як на гэта адказваць. Не хвалюйцеся, усё будзе нармальна».

Журналісты таксама пацікавіліся, што беларускі лідар прывёз у падарунак свайму расійскаму калегу, які якраз 7 кастрычніка адзначае юбілей. «Трактар», — адказаў Аляксандр Лукашэнка. Адказваючы на ўдакладняльнае пытанне, які менавіта трактар, Прэзідэнт сказаў: «Такі, на якім я працую, — BELARUS. Самы лепшы. Ручной зборкі». «З усімі насадкамі?» — прадоўжылі пытацца журналісты, маючы на ўвазе навяснае абсталяванне на трактар для правядзення тых ці іншых работ. «Насадак іх, ведаеш, мільён. Таму гэта па жаданні. Але я яму прапаную адну насадку — навяснае абсталяванне — сеялку. Будзем сеяць хлеб. Можа, яшчэ што-небудзь. Яна ўніверсальная. Вырасцім — і Дуду, і Маравецкаму (кіраўніцтва Польшчы. — **«Зв.»**), Еўропе, каб не галадалі. Каб не кралі ва Украіны хлеб, а везлі бедным краінам», — адказаў Аляксандр Лукашэнка.

У размове з журналістамі Прэзідэнт таксама асабліва адзначыў, што прыехаў на саміт на расійскім аўтамабілі AURUS.

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта.**

# РОСТ ЦЭН — НЕДАПУШЧАЛЬНЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У самой дырэктыве адзначаецца, што ў краіне склалася напружаная сітуацыя з ростам цэн на спажывецкім рынку. Інфляцыя значна перасягнула прагнозны паказчык і стала прычынай зніжэння даходаў грамадзян у рэальным выражэнні. Гэта нівелюе дзеянні ўрада па павышэнні заработных плат і пенсій. Дзяржаўныя органы не прынялі своечасовых сістэмных мер па выключэнні неабгрунтаванага росту цэн і кантролі за цэнавай дысцыплінай. Таму патрабуецца неадкладнае і жорсткае рэагаванне на ўсіх узроўнях.

### Якія рашэнні замацаваны ў дакуменце?

У мэтах абароны інтарэсаў грамадзян і арганізацый Рэспублікі Беларусь, недапушчэння далейшага росту цэн, устанаўлення эфектыўнай сістэмы цэнавага кантролю і забеспячэння ўнутранага спажывецкага рынку таварамі (работамі, паслугамі) дырэктывай прадугледжана, што з 6 кастрычніка 2022 года забараняецца павышэнне цэн, акрамя выпадкаў, вызначаных старшынямі аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама сумесна з міністрам антыманапольнага рэгулявання і гандлю і галіновымі міністрамі.

Кіраўнікам рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, іншых арганізацый, падпарадкаваных ураду, старшыням аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама даручана прыняць вычарпальныя меры па стрымліванні цэн і зніжэнні сабекошту прадукцыі, якая выпускаецца; насычэнні ўнутранага рынку пад поўную патрэбу; недапушчэнні неабгрунтаванага спынення дзейнасці гандлёвых аб'ектаў.

### Чым зоймецца рабочая група на чале з Наталляй Качанавай?

Дырэктывай фармалізавана яшчэ адно рашэнне кіраўніка дзяржавы па выніках праведзенай напярэдадні нарады аб стварэнні рабочай групы на чале са старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталляй Качанавай. У яе таксама ўвойдуць старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка, старшыня Камітэта дзяржкантролю Васіль Герасімаў, старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэта Іна Мядзведзева, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл Орда.

Рабочай групе даручана ў дзесяцідзённы тэрмін распрацаваць і прадставіць у Савет Міністраў прапановы аб мерах па ўдасканаленні цэнавага рэгулявання.

Да адпаведнай работы яны змогуць далучаць дэпутатаў усіх узроўняў, прадстаўнікоў Камітэта дзяржаўнага кантролю, іншых дзяржаўных органаў і арганізацый, прафсаюзаў.

Групе таксама даручана забяспечыць на пастаяннай аснове маніторынг цэн і стану спажывецкага рынку, інфармаваць кантралюючыя і праваахоўныя органы аб выяўленых парушэннях для прыняцця мер рэагавання.

### Якія даручэнні дадзены ўраду?

Ураду да 20 кастрычніка бягучага года неабходна будзе на аснове прапаноў рабочай групы зацвердзіць і ўвесці ў дзеянне сістэму рэгулявання цэн. Даручана таксама забяспечыць эфектыўны кантроль за цэнавай дысцыплінай.

### Якая будзе адказнасць за парушэнне норм дырэктывы?

Асобы, вінаватыя ў невыкананні (неналежным выкананні) патрабаванняў дырэктывы, нясуць адказнасць аж да крымінальнай. Такая мера прапісана ў самім дакуменце.

Генеральнай пракуратуры сумесна з Камітэтам дзяржаўнага кантролю даручана неадкладна даваць ацэнку дзеянням службовых асоб і іншых работнікаў па выкананні патрабаванняў дырэктывы, прымяняць меры працэсуальнага прымушэння, уключаючы ўзяцце пад варту.

Кантроль за выкананнем дырэктывы ўскладзены на КДК.

**Паводле БелТА.**

## Дарэчы

### Нарада па пытанні стабілізацыі цэнавай сітуацыі і стрымліванні тэмпаў інфляцыі ў краіне прайшла ўчора ў Савеце Рэспублікі

Для выпрацоўкі мер па рэгуляванні цэн па даручэнні кіраўніка дзяржавы створана рабочая група на чале з Наталляй Качанавай. Ужо сфарміраваны яе склад. У рабочую групу ўвайшлі кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў, члены Савета Рэспублікі, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і іншыя эксперты.

«Многія з вас былі ўдзельнікамі ўчарашняй нарады ў кіраўніка дзяржавы. Усе азнаёмлены з дырэктывай, што ўчора выйшла, дзе дакладна вызначаны задачы, якія павінна выканаць рабочая група. Мы сёння запрасілі такі склад. Але можам яго пашыраць, запрашаючы на нашы пасяджэнні іншых экспертаў, каб унесці ва ўрад прапановы. Ураду даручана прыняць пастанову, якая дасць магчымасць не дапусціць росту цэн і знізіць інфляцыю ў нашай краіне да параметраў, абазначаных кіраўніком дзяржавы на нарадзе. Вядома, мы павінны працаваць аператыўна, таму што часу ў нас не так шмат. Разам з тым усё, што мы адпрацуем, павінна сапраўды быць эфектыўным, і тыя прапановы, якія мы выпрацоўваем, павінны стабілізаваць сітуацыю з цэнамі на спажывецкім рынку», — адзначыла Наталля Качанава.

Паводле яе слоў, першая рабочая нарада — своеасаблівы мазгавы штурм. «Мы павінны ісці ад фінішнай прамой, чаго мы павінны дасягнуць у выніку», — падкрэсліла спікер.

Наталля Качанава ўпэўнена: сенатарам і Камітэту дзяржкантролю неабходна аб'ядналь намаганні, і тады маніторынг цэн будзе больш эфектыўны.

Усе міністэрствы далажылі, што даручэнні, дадзеныя напярэдадні кіраўніком дзяржавы, аператыўна выкананы. Так, Камітэт дзяржкантролю пачаў маштабны маніторынг цэн у гандлёвых аб'ектах. Адкрыты кароткі нумар 191 для прыёму паведамленняў аб фактах завышэння цэн. Званкі ад насельніцтва актыўна паступаюць. У КДК упэўнены, што іх будзе ўжо больш. «На кожны сігнал мы абавязкова рэагуем», — запэўнілі ў ведамстве.

Блізкая ўлада

Наталля КАЧАНАВА:

# «Мы павінны вырашаць пытанні людзей аператыўна і эфектыўна»

**Выязное пашыранае пасяджэнне Савета Рэспублікі адбылося 7 кастрычніка ў Фаніпалі. Падчас яго сенатары падвялі вынікі работы са зваротамі грамадзян у Мінскай вобласці за студзень — жнівень бягучага года. За апошнія восем месяцаў колькасць такіх зваротаў у рэгіёне дасягнула больш за 4,5 тысячы. Сенатары правялі каля 280 прамых тэлефонных ліній, больш за 500 асабістых прыёмаў. Акрамя таго, больш за тры разы была арганізавана тэлефонная лінія ў новым фармаце — званок ад спікера. На рэгулярнай аснове праводзяцца сустрэчы з працоўнымі калектывамі і насельніцтвам, у тым ліку на дыялогавых пляцоўках.**

Падчас пасяджэння **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** звярнула ўвагу на тое, што арсенал узаемадзеяння з людзьмі даволі шырокі. Акрамя асабістага прыёму, грамадзяне могуць скарыстацца электроннымі зваротамі, тэлефоннымі лініямі. Падсумоўваючы вынікі адзінага дня прыёму грамадзян у Мінскай вобласці, які адбыўся 5 кастрычніка, Наталля Качанава адзначыла актыўнасць людзей:

— Для нас вельмі важна, што прагучалі тыя пытанні, якія мы літаральна зараз адпрацоўваем у Савеце Рэспублікі на экспертных нарадах, напрыклад дзейнасці садоўніцкіх таварыстваў. Я ўбачыла тых людзей, якіх можна запрасіць на пасяджэнне экспертнага савета, каб яны выказалі свае прапановы, якія будуць для нас вельмі важныя ў прыняцці гэтага законапраекта. Роўна так, як мы, адпрацоўваючы законапраект па аграэкатурызме, запрашалі людзей, што прыходзілі на прыём і звярталіся са сваімі адпаведнымі праблемамі. Гэта значыць, мы сёння не проста прыязджаем выслухаць людзей, але актыўна далучаем іх да вырашэння гэтых праблем, для таго, каб вызначыць, наколькі гэтая праблема актуальная для таго ці іншага рэгіёна, для жыхароў краіны ў цэлым. Таму заўсёды радуе тое, што людзі актыўныя, і гэта праўда. Людзі прыходзяць, расказваюць не толькі пра асабістыя праблемы, але і пра перажыванні за сваю малую радзіму, што зачынілася тая ці іншая ўстанова, як трэба развіваць іх рэгіён, як трэба берагчы і сумеснымі намаганнямі рабіць усё для таго, каб уладкаваць, навесці парадак у тым ці іншым аграгарадку ці пасёлку. Гэта выдатна.

Спікер звярнула ўвагу на неабходнасць узаемадзеяння з людзьмі, разумення іх настрою і пажаданняў:

— Дзе мы можам дапамагчы — мы павінны дапамагаць. Прэзідэнт заўсёды кажа, што мы павінны працаваць на апярэджанне, вырашаць пытанні грамадзян аператыўна і эфектыўна. А практычна 80 % зваротаў, якія паступаюць да нас, а можа, і больш, — гэта пытанні мясцовых органаў улады. Людзі прывыклі, што ў іх павінна быць цёпла, чыста, светла, яны павінны своечасова атрымліваць медыцынскую дапамогу, усе сацыяльныя выгоды.

Менавіта таму Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла неабходнасць павелічэння актыўнасці дэпутацкага корпуса — людзей, якія непасрэдна працуюць на месцах і бачаць праблемы:

— Калі вы бачыце праблему, павінны прыняць усе меры для таго, каб гэтае пытанне было вырашана. Тут павінна быць поўнае ўзаемадзеянне. Калі яно ёсць паміж выканаўчай, заканадаўчай уладамі, жыхарамі горада або раёна, тады, канешне, гэтыя пытанні вырашаюцца аператыўна і людзі ў цэлым задаволены. А задаволеныя тым, што робіцца ў іх горадзе, пасёлку, вёсцы, — падсумавала Наталля Качанава.

**Арына КАРПОВІЧ.**

*Больш падрабязна аб выніках пашыранага пасяджэння чытайце ў наступным нумары «Мясцовага самакіравання».*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Пяскоў пракаментаваў паведамленні аб расколе ў асяроддзі Пуціна з-за СВА

Прэс-сакратар прэзідэнта Расіі Дзмітрый Пяскоў заявіў The Washington Post, што спрэчкі ў асяроддзі кіраўніка дзяржавы Уладзіміра Пуціна на тэму спецаперацыі не з'яўляюцца прыкметай расколу, а адбываюцца ў рамках звычайнага рабочага працэсу. Пяскоў адзначыў, што прэзідэнт прыняў ключавыя рашэнні, у ліку якіх аб'яўленне частковай мабілізацыі. «Накont такіх момантаў ёсць рознагалоссі. Некаторыя думаюць, што мы павінны дзейнічаць інакш, але ўсё гэта частка звычайнага рабочага працэсу», — сказаў ён. Па словах прадстаўніка Крамля, абмеркаванне СВА, эканомікі ці сферы адукацыі расійскімі ўладамі — гэта не прыкмета расколу. Акрамя таго, Пяскоў абверг інфармацыю аб тым, што хтосьці з найбліжэйшага акружэння Пуціна нібыта адкрыта заявіў аб нязгодзе з рашэннямі расійскага лідара.

Раней Пяскоў таксама абверг інфармацыю ў СМІ аб тым, што кіраўнік дзяржавы Уладзімір Пуцін выступіць са зваротам да нацыі аб змяненні статусу спецаперацыі.

### Ва Украіне забаранілі расійскую музыку на тэлебачанні, радыё і ў грамадскіх месцах

Украіна з 7 кастрычніка забараняе на сваёй тэрыторыі расійскую музыку. Пра гэта паведамляе ТАСС са спасылкай на апублікаваны ўчора закон, у якім гаворыцца аб «абмежаванні публічнага выкарыстання музычнага прадукту» з РФ.

У прыватнасці, расійскія музычныя творы не павінны зараз гучаць на ўкраінскім тэлебачанні, радыё і ў грамадскіх месцах. Пад забаронай таксама аказаліся гастролі расійскіх выканаўцаў.

# ПРА ВЫКЛІКІ, ПАГРОЗЫ І ГАТОЎНАСЦЬ ІМ СУПРАЦЬСТАЯЦЬ

## «ДЗЯРЖАВЫ ЗАХОДНЯЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ ВАЮЮЦЬ ЗА СВАЁ БАГАТАЕ ЖЫЦЦЁ РУКАМІ ЎКРАІНЦАЎ»

Аб сітуацыі ў ваеннай сферы ў краінах-суседках Беларусі расказаў **міністр абароны Віктар ХРЭНІН**.

— Аб'ектыўная ваенна-палітычная абстаноўка вакол нашых граніц складваецца вельмі няпростая. Яна развіваецца пад уплывам беспрэцэдэнтнага ваенна-палітычнага супрацьборства паміж Расіяй і так званым калектыўным Захадам на чале са Злучанымі Штатамі. Яшчэ год таму мы бачылі ўзрослую напружанасць у супрацьстаянні краін Захаду з дзяржавамі, якія не жадаюць адступацца ад свайго суверэнітэту, стаць калоніямі заходняй цывілізацыі. На неаднаразовыя заклікі да здаровага сэнсу з боку Беларусі не было рэакцыі з боку ўлад і прадстаўнікоў еўрапейскіх дзяржаў. Пры гэтым дастаткова згадаць, колькі разоў за апошнія гады Прэзідэнт нашай краіны ў сваіх выступленнях, інтэрв'ю і зваротах агучваў мірныя ініцыятывы па разрадцы сітуацыі, — адзначыў Віктар Хрэнін.

Захад і падкантрольныя яму дзяржавы працягвалі мэтанакіравана нагнятаць абстаноўку, расказаў міністр. Пад выглядам барацьбы з міграцыйным крызісам у Польшчы на граніцы з Беларуссю засяродзілі сілы і сродкі трох з чатырох буйных польскіх сухапутных аб'яднанняў. Адначасова з боку Украіны пад выглядам вучэнняў, на якіх Беларусь была абазначана як праціўнік, таксама ішло нарошчванне войскаў на ўкраінска-беларускай граніцы. Практычна Захад адкрыта дэманстраваў гатоўнасць развязваць агрэсію супраць Беларусі. Цалкам заканамерна, што такая напружанасць перайшла ў гарачую фазу.

— Пры гэтым спецыяльная ваенная аперацыя, якую вымушана пачала Расійская Федэрацыя, — не чарговы лакальны ваенны канфлікт. Ваеннае супрацьстаянне ва Украіне — гэта знешняя праява глабальнага цывілізацыйнага супрацьстаяння паміж Захадам і Усходам. Менавіта за сваё багатае жыццё ваююць сёння дзяржавы заходняй цывілізацыі на тэрыторыі Украіны рукамі ўкраінцаў у сучаснай версіі поўнамаштабнай проксі-вайны супраць Расіі. Пры гэтым наша краіна, як стратэгічны саюзнік Расіі, таксама ўцягнута ў гэта супрацьстаянне, — удакладніў міністр.

Аналіз міжнароднай абстаноўкі дазваляе зрабіць шэраг высноў, якія сведчаць аб прамых выкліках ваеннай бяспецы Беларусі, дадаў ён. У прыватнасці, нягледзячы на адсутнасць яўных прыкмет да развязвання ваеннай агрэсіі, небяспека магчымага задзейнічання разгорнутых вакол нашых граніц войскаў супраць Беларусі застаецца. Пацвярджэнне гэтаму — беспрэцэдэнтнае нарошчванне прысутнасці амерыканскіх і натаўскіх войскаў і фарміраванняў ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне, у тым ліку ў суседніх з намі краінах пад псеўдалозунгам абароны ад пагрозы з Усходу.

Віктар Хрэнін адзначыў, што ўжо цяпер у Еўропе дыслацыруецца больш за 60 тысяч ваеннаслужачых ЗША, аснашчаных сучаснай ударнай зброяй, а таксама каля 35 тысяч — у межах аперацый, якія праводзяцца ва Усходняй Еўропе, з іх больш за 22 тысячы сканцэнтраваны ў Польшчы і краінах Балтыі.

Акрамя сухапутнай, у еўрапейскай зоне створаны авіяцыйная і ваенна-марская групоўкі, якія ўжо цяпер налічваюць каля 2,2 тысячы баявых самалётаў. У Балтыйскім і Міжземным морах пастаянна знаходзіцца да 10 носьбітаў крылатых ракет марскога і паветранага базіравання з агульным боезапасам да 450 адзінак.

— Пры гэтым у выпадку развязвання Захадам ваеннай агрэсіі гэтыя караблі і самалёты будуць здольныя наносіць удары па нашых аб'ектах і войсках на ўсю глыбіню тэрыторыі Беларусі, — падкрэсліў Віктар Хрэнін. Ён расказаў, што ў суседніх краінах, якія ўваходзяць у блок НАТА, ствараюцца перадавыя плацдармы для захавання тэхнікі, у Польшчы, Літве і Латвіі ажыццяўляецца рэканструкцыя вучэбных цэнтраў і палігонаў для забеспячэння дзейнасці воінскіх кантынгентаў НАТА. Будуюцца новыя мабільныя лагеры кантэйнернага тыпу для размяшчэння асабовага складу. І нават існуючая ўжо сёння інфраструктура забяспечвае перакід і размяшчэнне войскаў з кантынентальнай часткі ЗША колькасцю да дывізіі і эскадрыллі авіяцыі — больш за 20 тысяч чалавек.

— Па нашай ацэнцы, у перспектыве нарошчванне баявога патэнцыялу Узброеных Сіл дазволіць Польшчы самастойна, амаль без падтрымкі НАТА, праводзіць ваенныя аперацыі з абмежаванымі мэтамі, — заявіў Віктар Хрэнін, дадаўшы, што і краіны Балтыі ўмацоўваюць абаронны патэнцыял, робячы ўпор на прыёме і размяшчэнні замежных вайсковых фарміраванняў.

У развіцці сітуацыі вакол Беларусі негатыўныя тэндэнцыі будуць пераважаць, захаваецца верагоднасць выкарыстання заходнімі цэнтрамі прыняцця рашэнняў сілавых метадаў да дасягнення сваіх мэт. Прапарцыянальна ціску Захаду на Расію з мэтай яе сцірання з палітычнай карты свету ўзровень ваеннай небяспекі для Беларусі будзе мець тэндэнцыю для ўзрастання. Нельга выключыць з'яўленне рэальнай пагрозы распальвання ў Беларусі ўнутранага канфлікту з далейшым знешнім умяшаннем у яго выграшэнні з боку Захаду з тэрыторыі Польшчы, Літвы, Латвіі і Украіны.

У такіх умовах асноўнай задачай з'яўляецца рэалізацыя эфектыўнай ваеннай палітыкі, якая дазволіць супрацьстаяць сучасным ваенным пагрозам. Упор зроблены на цэлы шэраг мер стратэгічнага стрымлівання. Сёння войскі выконваюць задачы баявога дзяжурства ва ўзмоцненым рэжыме, пастаянна вядзецца выведка ва ўсіх не выглядах, арганізаваны абмен разведвальнай інфармацыяй з нашымі саюзнікамі, ажыццяўляецца ахова дзяржаўнай граніцы нашай краіны, прадугледжаны меры па спыненні ваенных правакацый.

— Лічым, што меры стратэгічнага стрымлівання, якія рэалізоўваюцца Узброенымі Сіламі, забяспечваюць дэманстрацыю гатоўнасці да абароны нашай краіны і нанясенні непрымальнага ўрону праціўніку. Але ў аснове нашай ваеннай стратэгіі застаецца пазіцыя, што больш мэтазгодна не бразгаць зброяй, а дамаўляцца за сталом перагавораў, — рэзюмаваў Віктар Хрэнін.

Падрабязней пра абстаноўку каля нашых граніц расказаў **старшыня Дзяржпагранкамітэта Анатоль ЛАПО**. Яна застаецца прагназаванай і кантралюемай.

— Калі ўзяць польскі напрамак, то сумежны бок працягвае будаўніцтва загарод. Ужо зараз узведзена 180 кіламетраў. Практычна ўвесь сухапутны ўчастак граніцы яны перакрылі плотам. Але яго будаўніцтва не дало чаканых вынікаў па стрымліванні нелегальнай міграцыі. Акрамя таго, на граніцу выведзена каля сямі тысяч чалавек: пагранічнікі, Узброеныя Сілы, тэрытарыяльная абарона, — расказаў Анатоль Лапо.

Паводле слоў старшыні Дзяржпагранкамітэта, на асобных напрамках беларускай граніцы пастаянна вядзецца паветраная і ваенная разведка, дзейнічаюць спецпадраздзяленні польскіх узброеных сіл. У гэтых умовах Польшча працягвае дэманстратыўнае выціскванне тых мігрантаў, якіх яна ўтрымлівала ў сябе і якія прыехалі з Германіі.

## «ІДЗЕ КАРДЫНАЛЬНАЯ ПЕРАБУДОВА СВЕТУ»

Як адзначыў **старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Іван ТЭРТЭЛЬ**, ведамства канстатуе сур'ёзнае абвастрэнне абстаноўкі ў нашым рэгіёне і ў сусветным маштабе.

— Калі праводзіць паралелі, то мы выходзім да перыяду так званага Карыбскага крызісу. Фон прыкладна такі ж. Па даных нашай разведкі, пытанне, якое цяпер найбольш абмяркоўваецца на Захадзе, — «Ці будзе прыменена ядзерная зброя, пры якіх умовах і якія чырвоныя лініі?». Захад прагнозна развіццё сітуацыі ў выпадку абмену ўдарамі.

Іван Тэртэль падкрэсліў, што ідзе кардынальная перабудова свету і немагчыма прадказаць, у што гэта выльецца. Кіраўнік КДБ акрэсліў сітуацыю вакол Беларусі. У прыватнасці, паведаміў, што ў стварэнні так званага пераходнага кабінета беларускай апазіцыі ўдзельнічалі спецслужбы і паліттэхнолагі ЗША. Распавёў ён і пра планы розных груп, што знаходзяцца за мяжой.

— Плануецца зайсці ўзброенай групе з тэрыторыі Украіны, заняць населены пункт, стварыць плацдарм і рухацца ў бок Мінска. Але для гэтага патрэбна напаленая палітычная абстаноўка, такая, якая была ў 2020-м.

Мяркуецца ажыццяўляць спробы ўскалыхнуць сітуацыю. Але сітуацыя знаходзіцца пад кантролем і «розум возьме верх», паабяцаў Іван Тэртэль.

## «ЭКАНОМІКА ВЫЙШЛА НА ТРАЕКТОРЫЮ АДНАЎЛЕНЧАГА РОСТУ»

**Прэм'ер-міністр краіны Раман ГАЛОЎЧАНКА** расказаў, што адбываецца ў рэальным сектары эканомікі. Ён нагадаў, што краіна жыве ў рэжыме санкцый дастаткова даўно і іх амаль не заўважала. Аднак з канца 2021 і ў 2022 годзе яныператварыліся ў маштабны ціск. Пад ім аказаліся цэлыя галіны і асноўныя флагманы беларускай вытворчасці.

— Санкцыі ў дачыненні да Беларусі і Расіі ў чымсьці пераклікаюцца і носяць беспрэцэдэнтны маштаб. Канчатковая задума Захаду відавочная — нанесці ўрон дабрабыту людзей. Разлік на тое, што падсанкцыйныя прадпрыемствы не змогуць ствараць прадукцыю, плаціць зарплаты, прэміі і забяспечваць той узровень жыцця, да якога прызвычаіліся грамадзяне. Такая простая і няхітрая задача, — расказаў Раман Галоўчанка.

Пры гэтым ён прывёў лічбу: аб'ём беларускага экспарту, які трапіў пад прамыя забароны, складае 15-16 мільярдаў долараў. Дадаткова 4-5 мільярдаў — экспарт ва Украіну, які таксама выпаў. Такім чынам краіна магла б згубіць каля 20 мільярдаў долараў — вялікая лічба для плацежнага балансу краіны, якая без прыняцця мер магла б выклікаць сур'ёзнае ўздзеянне на эканоміку.

У адказ на санкцыі беларускі ўрад выбудаваў сістэму рэагавання: аператыўныя штабы па супрацьдзеянні санкцыям, у тым ліку на ўзроўні Савета Міністраў і прэм'ер-міністра.

— На маім асабістым кантролі каля 150 прадпрыемстваў, якія я курырую ў штотыднёвым рэжыме, адсочваючы іх стан, эфектыўнасць і ўстойлівасць па 15 паказчыках, — адзначыў кіраўнік урада. — Было б звышаптымістычна чакаць, што санкцыі ніяк не паўплываюць, гэта вельмі сур'ёзны і масіраваны ўдар. Таму натуральна, што на пэўным этапе эканоміка згубіла частку сваёй валавой дабаўленай вартасці.

Гэта лічба склала каля 5 % (а не 20, як прадракалі некаторыя), тым часам у жніўні ВУП вырас на 0,3 % і склаў 95,1 %, што сведчыць пра выхад эканомікі на траекторыю аднаўленчага росту.

Наша краіна сёлета больш прадае, чым набывае, — забяспечана станоўчае сальда знешняга гандлю ў памеры 2,8 мільярда долараў. Па словах прэм'ер-міністра, гэта гістарычны максімум для Беларусі. Прамыя замежныя інвестыцыі за першае паўгоддзе склалі 1,7 мільярда долараў.

— Усе складаныя сітуацыі ў нашых людзей праецыруюцца праз «абменнікі». У няпростыя часы людзі набываюць валюту і забіраюць уклады. Тым не менш па гэтым, хутчэй псіхалагічным, крытэрыі ўсё спакойна: ажыятажнага попыту на валюту няма, больш за тое, з пачатку года насельніцтва на чыстай аснове прадало каля 400 мільёнаў долараў ЗША. Важна і тое, што расце колькасць дэпазітаў у беларускіх рублях. З пачатку года тэрміновыя дэпазіты насельніцтва ў рублях выраслі практычна на мільярд ці на 20 %, — прывёў лічбы Раман Галоўчанка. — Беларускі рубель умацаваўся да еўра аж на 17 %, да долара — на 4 %.

Такі важны паказчык, як аб'ём золатавалютных рэзерваў на 1 кастрычніка складае 7,5 мільярда долараў пры запланаваных сямі мільярдах. Выручка беларускіх прадпрыемстваў сёлета павялічылася больш чым на 10 %.

Раман Галоўчанка падкрэсліў, што, нягледзячы на санкцыі, прамысловыя прадпрыемствы працуюць устойліва. У жніўні вытворчасць кар'ерных самазвалаў вырасла на 32 %, трактароў — на 7 %, інтэгральных мікрасхем — на 18 %, тэлевізараў — на 19 %.

Раман Галоўчанка нагадаў і пра крокі, якія рабіліся сёлета для павышэння дабрабыту насельніцтва. Тройчы падымалася базавая стаўка, ад якой залежыць зарплата ў бюджэтнай сферы і ваеннаслужачых. Кропкава павышалася зарплата ўрачоў, настаўнікаў, работнікаў дзіцячых садкоў. У выніку сярэдні ўзровень сярэдняй зарплаты вырас за восем месяцаў больш чым на 13 %. У жніўні яна складала 1665 рублёў, а ў бюджэтнай сферы — 1238 рублёў. Двойчы сёлета адбываўся пераразлік працоўных пенсій, тройчы павялічваліся сацыяльныя пенсіі, чарговае павышэнне чакаецца ў лістападзе.

Прэм'ер-міністр паведаміў, што ў найбліжэйшы час у Беларусі плануецца рэалізаваць доўгатэрміновыя інфраструктурныя праекты на восем мільярдаў рублёў. Гэта будаўніцтва школ, бальніц, дарог. А таксама вытворчыя праекты па даручэнні кіраўніка дзяржавы, іх 129 ва ўсіх раёнах краіны.

— Першы санкцыйны ўдар наша эканоміка вытрымала і перайшла ў мабілізацыйны рэжым. Пакуль што мэта нашых апанентаў не дасягнута. І трэба зрабіць усё, каб яна не была дасягнута. Напярэдзе яшчэ шмат работы, ціск, відавочна, будзе нарастаць. На Захадзе ёсць пэўная збянтэжанасць тым, што меры ў адносінах Расіі, Беларусі не далі плёну. Але і санкцыйны патэнцыял у Захаду вычарпаны. Таму самы цяжкі перыяд прайшоў ці мы яго пяройдзем у гэты час. Праблем, канечне, дастаткова. Сярод іх — інфляцыя, невялікае зніжэнне рэальных даходаў насельніцтва, адносна высокія стаўкі па крэдытах. Але гэта таксама плата за незалежнасць, — рэзюмаваў Раман Галоўчанка.

## НАСУПЕРАК САНКЦЫЙНЫМ АБМЕЖАВАННЯМ

Эканамічную сітуацыю акрэсліў і **міністр эканомікі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ**. Ён нагадаў, што супраць нашай краіны былі ўведзены санкцыі, яны аказалі негатыўны ўплыў ужо летась.

— Пад удар трапілі асноўныя флагманы нашай эканомікі, ад работы якіх залежыць функцыянаванне галін не толькі ў нашай краіне, але і ў сумежных дзяржавах — тых, што супраць нас гэтыя санкцыі і прынялі, — адзначыў міністр эканомікі. — Аднак зламаць нас не ўдалося, мы моцна навучыліся.

Насуперак санкцыйным абмежаванням летась беларуская эканоміка прадэманстравала рост — больш чым на 2 %. У цэлым 2021 год стаў адным з самых паспяховых з пункту гледжання знешняга гандлю — быў сфарміраваны прафіцыт у чатыры мільярды долараў. Адначасова паляпшаліся фінансавы стан прадпрыемстваў, чысты прыбытак, павялічылася заработная плата, аднавіўся рынак працы, узровень беспрацоўя быў самы мінімальны.

Сёлета Беларусь сутыкнулася з чарговымі выклікамі. Галіны падвергліся лагістычным абмежаванням, ускладнены разлікі з партнёрамі, узніклі складанасці з пастаўкамі камплектуючых. Гэта стала выпрабаваннем для нашай адкрытай эканомікі. Урад аператыўна адрэагаваў на выклікі. Гэта дало свае вынікі. Эканоміка развіваецца ўстойліва і збалансавана. Паляпшаецца дынаміка ВУП, па выніках васьмі месяцаў эканоміка дадала 0,3 %. Доля беларускіх тавараў на расійскім рынку сёлета вырасла з 5,5 % да 8 %, у Кітаі — з 2,2 % да 5 %.

**Алена КРАВЕЦ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# НЕВЫЧЭРПНАЯ КРЫНІЦА САМАБЫТНАСЦІ

## Работнікаў сферы культуры павіншавалі з прафесійным святам

**У Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага адбылося ўрачыстае мерапрыемства, прымеркаванае да Дня работнікаў культуры, які святкуецца ў гэту нядзелю. Сёлета адзначаецца шмат важных для нашай краіны дат: 140-годдзе з дня нараджэння класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа, 100-годдзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. З поспехам прайшлі буйныя культурныя форумы, якія ўжо сталі добрай традыцыяй: Дзень беларускага пісьменства, Славянскі базар у Віцебску, Фестываль беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне. Менавіта таму ў будынку тэатра работнікі сферы культуры, якія ўнеслі вялікі ўклад у гэтыя падзеі, атрымалі ганаровыя дыпломы і ўзнагароды.**



Падчас цырымоніі **міністр культуры Анатоль МАРКЕВІЧ** адзначыў, што ў паўсядзённым жыцці работнікам культуры даводзіцца ў найкарацейшыя тэрміны вырашаць вельмі складаныя задачы, працуючы без выхадных, каб дарыць людзям выдатны настрой:

— З вамі вельмі камфортна і надзейна працаваць. Нягледзячы на ўсе перыпетыі, мы заўсёды знаходзім ісціну і дасягаем пастаўленых задач. Назіраючы, як глядач захоплена апладзіруе пасля спектакля ці канцэрта, радуючыся, калі нашы хлопцы і дзяўчаты становяцца пераможцамі прэстыжных конкурсаў і фестываляў, гледзячы на абноўленыя будынкі ўстаноў культуры нашай краіны, з гонарам гаворым: мы гэта зрабілі разам. Я часта параўноўваў працу ў культуры з рэальным сектарам эканомікі і зразумеў, што наша праца не лягчэйшая, чым у полі ці каля станка. Бо сфера культуры — тая галіна з бесперапынным вытворчым цыклам, дзе творчы працэс не запавольваецца ні на секунду. У выніку мы атрымліваем выдатны, непаўторны культурны прадукт, — падкрэсліў Анатоль Маркевіч.

Пачынаючы ўрачыстае ўзнагароджанне, **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ігар ЛУЦКІ** агучыў віншаванне кіраўніка краіны. У ім Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што беларуская культура з'яўляецца ўнікальнай духоўнай скарбніцай народа, невычэрпнай крыніцай нашай самабытнасці і нацыянальнай годнасці. Прэзідэнт адзначыў, што найвышэйшым прызначэннем супрацоўнікаў культуры з'яўляецца адраджэнне народных традыцый і рамёстваў, захаванне гістарычнай памяці, стварэнне новых сучасных твораў мастацтва, а таксама выхаванне таленавітай моладзі.

Лаўрэатаў прэміі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму ў сферы культуры і мастацтва вызначылі ў шасці намінацыях.

Дыплом у катэгорыі «Літаратура, журналістыка, крытыка» атрымаў рэдактар аддзела культурнага жыцця рэдакцыі газеты «Гомельскія ведамасці» Дзмітрый Чарняўскі.

У намінацыі «Тэатральнае, экраннае, цыркавое мастацтва» найлепшым стаў Народны тэатр Краснапольскага раённага Цэнтра культуры.

Дыплом у намінацыі «Жывапіс, скульптура, графіка, дызайн і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» ўручылі Алене Катоўскай, бібліятэкару першай катэгорыі Лескаўскай сельскай бібліятэкі.

Узнагароду ў катэгорыі «Народная творчасць» атрымаў заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь, ансамбль танца, музыкі і песні «Белыя росы». У намінацыі «Бібліятэчная справа» лаўрэатам стала Тацццяна Барабаншчыкава, намеснік дырэктара Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі імя Леніна.

Дыплом у намінацыі «Музейная справа» ўручылі Брэсцкаму абласному краязнаўчаму музею.

З нагоды прафесійнага свята ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага таксама адбылася цырымонія ўзнагароджання супрацоўнікаў апарату Міністэрства культуры і работнікаў устаноў адукацыі ў сферы культуры. Падчас узнагароджання **міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Андрэй ІВАНЕЦ** адзначыў, што духоўная і маральная аснова з'яўляецца базісам пры фарміраванні асобы нашай моладзі:

— Сёння кожны з нас павінен быць не толькі адукаваным, але і выхаваным на нашых традыцыях, культуры, гісторыі. Менавіта гэтую працу робіце вы, дзякуючы гэтаму мы можам быць упэўнены, што заўтра прыйдуць выхаваныя, культурныя маладыя людзі, якія сфарміруюць будучыню нашай краіны — моцнай, незалежнай, квітнеючай Беларусі.

Дыпломы і падзякі работнікам культуры былі ўручаны Адміністрацыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Саветам Міністраў, Саветам Рэспублікі і Нацыянальным сходам. Свае віншавальныя пасланні накіравалі прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка і Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава.

**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

Медыясфера

# У ІНТАРЭСАХ АБ'ЕКТЫЎНАСЦІ

## Тэндэнцыі журналістыкі абмеркавалі на семінары «Мегаполіс — у люстэрку сучасных медыя»

**Вядомыя медыяэксперты і прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі з Беларусі, Расіі, Германіі, Турцыі, Польшчы, Кітая, Францыі, Казахстана і іншых краін, а таксама супрацоўнікі дзяржаўных органаў улады, дэпутаты, грамадскія дзеячы вызначылі пазіцыі па найбольш вострых пытаннях развіцця сучаснай медыясферы. Работа ва ўмовах канвергентнасці, жаночая тэма ў прэсе, барацьба з фэйкамі ў кантэксце выклікаў сучаснасці, бяспека журналіста — ключавыя аспекты, якія сталі прадметам дыскусій на некалькіх пляцоўках семінара.**

Як і задумвалася арганізатарамі — а гэта агенцтва «Мінск-Навіны» ў партнёрстве з Нацыянальнай камісіяй па справах ЮНЕСКА, Міністэрствам інфармацыі Беларусі, Мінгарвыканкамам, дэпутацкім корпусам, саюзамі журналістаў Беларусі і Расіі, іншымі творчымі і грамадскімі арганізацыямі, — па выніках работы секцый удалося выпрацаваць практыкаарыентаваныя рэкамендацыі для журналісцкай і экспертнай супольнасці ў гэты напружаны час.

### Ці захаваецца прафесія?

Пытанне бяспекі прадстаўнікоў масмедыя ўзняў **старшыня Беларускага саюза журналістаў, генеральны дырэктар агенцтва «Мінск-Навіны» Андрэй КРЫВАШЭЕЎ.** «І ў перыяд 2020 года, і цяпер, на фоне абвастрэння ваенна-палітычнай абстаноўкі каля нашых граніц, журналісты адчуваюць ціск, у першую чаргу анлайн, — адзначыў ён. — Прычым гэтая праблема, калі меркаваць па даных Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, Міжнароднай і Еўрапейскай федэрацый журналістаў, з'яўляецца глабальнай. У полі нашага зроку — абарона журналістаў, з аднаго боку, у лічбавай, віртуальнай прасторы, а з іншага боку, іх фізічная бяспека. З пункту гледжання абароны жыцця і здароўя журналістаў Беларусь дэманструе нядрэнныя вынікі ў сваім рэгіёне. За апошнюю чвэрць стагоддзя ў нас не было ніводнага выпадку гібелі журналіста ў выніку выканання ім сваіх прафесійных абавязкаў. Гэта сур'ёзнае дасягненне, паколькі, на жаль, рэгулярна даводзіцца выказваць спачуванні таварышам у іншых краінах з прычыны гібелі таго ці іншага нашага калегі: будзе гэта журналіст-расследавальнік, які ўзнімае тэму наркамафіі, трансгранічнай злачыннасці, ці нашы калегі-журналісты, якія працуюць у зоне баявых дзеянняў або замарожаных канфліктаў, што час ад часу ўспыхваюць на нашай прасторы».

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па міжнародных справах Андрэй САВІНЫХ** лічыць, што ў рабоце журналіста адбылася істотная трансфармацыя. «У мяне няма сёння адказу на адно канкрэтнае пытанне — ці захаваецца прафесія журналіста? — заўважыў парламентарый. — Мы ведаем вялікую колькасць прыкладаў прафесійнай журналісцкай дзейнасці, умоўна кажучы з XIX, нават XX стагоддзя, калі журналіст, рызыкуючы сабой, даносіў да грамадскасці інфармацыю, факты — такія, якія яны ёсць. Больш за тое, ён часам быў вымушаны прыбіраць асабістыя прыхільнасці ў інтарэсах аб'ектыўнасці. Пагадзіцеся, такі падыход да прафесіі нават не зусім прафесійны: гэта падыход да прафесіі як да місіі».

Дэпутат параўнаў журналіста таго перыяду з настаўнікам, за плячыма якога — вялікі вопыт. «На жаль, прафесія цяпер падвяргаецца размыванню, і гэтыя стандарты, па сутнасці, змяняюцца ў нас на вачах, — канстатаваў Андрэй Савіных. — Аб'ектыўнасць падмяняецца эмацыянальным падыходам у атрыманні інфармацыі, які дазваляе журналісту казаць толькі тое, што яму падабаецца, тое, што ён пражывае і лічыць каштоўным. Такі падыход, па вялікім рахунку, знішчае аснову журналістыкі, і журналіст незаўважна для сябе ператвараецца ў антаганіст». У сувязі з гэтым галоўная пагроза для журналіста, на думку парламентарыя, ідзе не з боку пэўных структур, якія могуць нанесці шкоду. Пагроза ідзе знутры самога чалавека, бо часам падрыхтаваць тэндэнцыйны матэрыял вельмі выгадна.

### Баявая адзінка

Свет не стаіць на месцы, усё змяняецца. Дынамічныя працэсы адбываюцца і ў інфармацыйным асяроддзі ў тым ліку. «Вельмі многае змянілася пасля 2020 года, — акцэнтавала ўвагу **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама Вольга ЧАМАДАНАВА.** — Да 2020 года мы закалыхвалі, супакойвалі, пазітыўна, прыгожа расказвалі — магчыма, да чагосьці не даходзілі, магчыма, наўмысна ці яшчэ па нейкіх прычынах. 2020 год прымусіў журналістаў, як кажа наш Прэзідэнт, распранацца і працаваць. Мы ўбачылі іншую журналістыку: рэзкую, больш агрэсіўную. Мы ўбачылі новыя медыйныя аблічы. Сёння ў нас абсалютна новыя, цікавыя тэлепраекты, іншая друкаваная прэса. Бачым, як імкліва развіваюцца месенджары, сацыяльныя сеткі, якія з'яўляюцца новымі пляцоўкамі. Самае галоўнае — павысіўся рэйтынг нашых дзяржаўных СМІ».

Па словах **сакратара Саюза журналістаў Расіі Цімура ШАФІРА**, у Мінску казаць аб супрацьдзеянні фэйкам і сваім вопыце няправільна. «Беларусь перажыла ўдар фэйкаў у 2020 годзе, накіраваны на знішчэнне дзяржаўнасці, — канстатаваў медыяэксперт. — Потым ужо з хвалямі фэйкаў сутыкнуліся іншыя краіны, уключаючы Расію. Аднак Беларусь была першай, хто супрацьстаяў ім». Кажучы аб уплыве сучасных тэхналогій на работу журналіста, Цімур Шафір падкрэсліў, што любая тэхналогія нясе ў сабе пэўныя рызыкі. «Гэта гадоў 10—15 таму нас прыводзілі ў трапятанне тыя, хто ўмеў карыстацца сканерамі, ноўтбукамі і іншай сучаснай тэхнікай, — удакладніў ён. — Сёння ў гэтым плане беларускія і расійскія журналісты нават наперадзе еўрапейскіх калег. Канвергентныя тэхналогіі дазваляюць хутка перадаваць навіны ў рэдакцыю. Дзякуючы сучасным тэхналогіям журналіст стаў сапраўднай баявой адзінкай».

На жаль, нярэдка прадстаўнікі масмедыя з'яўляюцца і аб'ектам фізічнага гвалту, мішэнню. Так здарылася і з **французскім журналістам Адрыянам БАКЕ**. Падчас камандзіроўкі на Данбас ён зняў дакументальны фільм, які, мякка кажучы, не прыйшоўся даспадобы тым, хто знаходзіцца ва ўладзе ва Украіне. І не толькі. За непрымальны кантэнт для французскіх улад, якія заплюшчваюць вочы на тое, што адбываецца ва Украіне, Адрыян Баке трапіў у турму на радзіме. Там ён прайшоў праз катаванні, аднак з дапамогай адваката змог апынуцца на волі. Цяпер малады чалавек жыве ў Расіі. Нядаўна падчас візіту ў Турцыю на журналіста было здзейснена нападзенне. Шматлікія раны на твары яшчэ не зажылі, а ён ужо прыехаў у Мінск, каб расказаць, у якіх умовах цяпер даводзіцца працаваць тым, хто трансліруе ўсяму свету праўду.

«Учора я апублікаваў здымкі, якія паказваюць, што Францыя ўмяшаная ў гэтую вайну і здзейсніла хімічную атаку на Украіну 11 жніўня 2022 года, — паведаміў Адрыян Баке. — Таксама мы знайшлі рэшткі бомбы, на якіх аказаліся французскія надпісы. Гэта неабвержны доказ. Нам пашанцавала знайсці нумар і серыю гэтай зброі. Ніхто не можа адмаўляць, што Францыя ў гэтым задзейнічана. Тры тыдні таму мы прадставілі доказы таго, што ўкраінская армія ўдзельнічае ў знішчэнні свайго насельніцтва. Маё забойства заказалі. Я незалежны ваенны журналіст і эксперт па балістыцы: магу распазнаць зброю, якая трапляе на тэрыторыю Данбаса».

Нягледзячы на тое, што даводзіцца працаваць з рызыкай для жыцця, французскі журналіст працягвае расследаванне. Неўзабаве ён плануе вярнуцца на Данбас, дзе будзе здымаць рэпартажы, а значыць, даносіць праўду шырокай грамадскасці. Менавіта гэта — адна з тэндэнцый сучаснай журналістыкі, пра якую так шмат гаварылі на медыйным семінары.

**Вераніка КАНЮТА.**

*На пляцоўках семінара адбылося ўзнагароджанне пераможцаў рэспубліканскага творчага конкурсу «Год гістарычнай памяці ў СМІ Беларусі». Беларускага саюза журналістаў. У намінацыі «Найлепшы праект, прысвечаны Году гістарычнай памяці» першае месца прысуджана Выдавецкаму дому «Звязда» за рубрыку «Без грыфа «сакрэтна», аўтарамі якой з'яўляюцца журналіст газеты Вераніка Канюта і вядучы навуковы супрацоўнік аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Вячаслаў Селяменеў.*

# СА СВЯТАМ, БЕЛАРУСКАЯ ПОШТА!

**Напярэдадні Сусветнага дня пошты, які адзначаецца 9 кастрычніка, у Прэс-цэнтры Дома прэсы адбылася прэс-канферэнцыя на тэму «Уклад беларускай пошты ў развіццё сусветнай паштовай сеткі». Удзел у ёй прынялі намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Алена ДРАЗДОВІЧ і начальнік вытворчасці «Мінская пошта» Людміла ШЫМАНСКАЯ.**

У сваім выступленні Алена Драздовіч, у прыватнасці, адзначыла, што беларуская пошта з 1947 года — паўнапраўны член Сусветнага паштовага саюза. З'яўляючыся часткай сусветнай паштовай супольнасці, беларуская пошта робіць свой унёсак у развіццё сусветнай паштовай сеткі. Сёння РУП «Белпошта» ажыццяўляе абмен міжнароднымі паштовымі адпраўленнямі са 192 краінамі свету.

На прадпрыемстве працуе больш за 21 000 работнікаў. Транспартна-лагістычная сістэма прадпрыемства — гэта звыш 1700 аўтамабіляў, якія забяспечваюць перавозку і дастаўку пошты і друкаваных СМІ больш чым па 1100 паштовых маршрутах, агульная працягласць якіх складае каля 165 000 км, і сетка аб'ектаў паштовай сувязі дазваляюць РУП «Белпошта» ажыццяўляць прыём і дастаўку паштовых адпраўленняў і друкаваных СМІ ў любы пункт Рэспублікі Беларусь.

Прадпрыемства ставіць перад сабой задачу трансфармаваць, палепшыць якасць паслуг, ісці ў нагу са часам і адказваць запатрабаванням рынку. З дапамогай лічбавай трансфармацыі беларуская пошта імкнецца значна спрасціць узаемадзеянне кліента з паштовым апаратам. РУП «Белпошта» рэалізавала шэраг праектаў, арыентаваных на павышэнне якасці паслуг, укараніла новыя паслугі і сэрвісы, у тым ліку звязаныя з развіццём электроннага гандлю як на міжнародным, так і ўнутраным рынку.

Намеснік генеральнага дырэктара падрабязна расказала журналістам аб усіх навоўвядзеннях, якія адбыліся ў паштовай галіне апошнім часам, а таксама павіншавала з прафесійным святам усіх работнікаў прадпрыемства і кліентаў РУП «Белпошта».

Людміла Шыманская расказала аб аптымізацыі сталічнай паштовай сеткі і новых паслугах, якія ўведзены ў аддзяленнях паштовай сувязі Мінска.

# Пераможны дубль Брэсцкага філіяла

**Па традыцыі ў верасні на базе адпачынку «Дружба» прайшоў XXV Рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства работнікаў аб'ектаў паштовай сувязі РУП «Белпошта». На працягу трох дзён за званне найлепшых прафесіяналаў паштовай справы змагаліся 42 работнікі, пераможцы рэгіянальных этапаў конкурсу. Трэба дадаць, што свята паштовага майстэрства праводзілася ў рамках Сусветнага дня пошты і Года гістарычнай памяці.**



**Намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» па эксплуатацыйнай дзейнасці Алена ДРАЗДОВІЧ звяртаецца да ўдзельнікаў з прывітальным словам.**

Перад узнагароджаннем пераможцаў з цёплымі словамі падтрымкі, падзякі і захаплення да каманд-удзельнікаў звярнуліся намеснік генеральнага дырэктара па эксплуатацыйнай дзейнасці РУП «Белпошта» Алена Драздовіч і старшыня першаснай прафсаюзнай арганізацыі прадпрыемства Анжаліка Дробава.




**Каманда-пераможца (першая з левага боку Ірына КАНДРАЦЮК).**

Таксама ў рамках цырымоніі закрыцця конкурсу адбылося ўрачыстае віншаванне начальніка аддзела эксплуатацыі паштовай сувязі і распаўсюджвання друку Магілёўскага філіяла Валянціны Ганчаровай, якая ў апошні дзень конкурсу адзначыла юбілей. Дарэчы, паштовай справе Валянціна Сямёнаўна прысвяціла 42 гады свайго жыцця. Працавала аператарам сувязі, начальнікам аддзялення сувязі (у 18 гадоў!), начальнікам участка па апрацоўцы, сартаванні і дастаўцы паштовых адпраўленняў, старшым інструктарам, бухгалтарам-рэвізорам, вядучым эканамістам, начальнікам раённага вузла паштовай сувязі, начальнікам аддзела эксплуатацыі і бяспекі паштовай сувязі, намеснікам дырэктара Магілёўскага філіяла.

І вось настае доўгачаканы момант віншавання пераможцаў. Па выніках XXV Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства работнікаў аб'ектаў паштовай сувязі РУП «Белпошта» першае месца сярод начальнікаў аб'ектаў паштовай сувязі заняла Алена Навумік — начальнік аддзялення паштовай сувязі № 6 горада Баранавічы Баранавіцкага рэгіянальнага вузла паштовай сувязі Брэсцкага філіяла. Другое месца ў Ганны Ракавец — начальніка аддзялення паштовай сувязі № 13 горада Мінска вытворчасці «Мінская пошта». На трэцім — Ірына Васьковіч, начальнік аддзялення паштовай сувязі № 6 г. Наваполацка Полацкага рэгіянальнага вузла паштовай сувязі Віцебскага філіяла.

Сярод спецыялістаў па паштовай дзейнасці аб'ектаў паштовай сувязі на першым месцы Дар'я Ігнацюк — спецыяліст па паштовай дзейнасці аддзялення паштовай сувязі № 6 г. Кобрына Бярозаўскага рэгіянальнага вузла паштовай сувязі Брэсцкага філіяла. На другім — Кацярына Лукіна, спецыяліст па паштовай дзейнасці аддзялення паштовай сувязі № 10 г. Брэста Брэсцкага рэгіянальнага вузла паштовай сувязі Брэсцкага філіяла. Трэцяе — у Вікторыі Папко, спецыяліста па паштовай дзейнасці аддзялення паштовай сувязі № 37 г. Мінска вытворчасці «Мінская пошта».

Першае месца сярод паштальёнаў па дастаўцы паштовых адпраўленняў і друкаваных сродкаў масавай інфармацыі аб'ектаў паштовай сувязі заняла Ганна Падабедава, паштальён аддзялення паштовай сувязі № 1 г. Віцебска Віцебскага аб'яднанага цэха паштовай сувязі Віцебскага філіяла. Другое — у Таццяны Арцёмчык, паштальёна аддзялення паштовай сувязі № 2 г. Ляхавічы Баранавіцкага рэгіянальнага вузла паштовай сувязі Брэсцкага філіяла. Трэцяе месца заняла Марыя Невяроўская, паштальён аддзялення паштовай сувязі № 5 г. Гомель Гомельскага аб'яднанага цэха паштовай сувязі Гомельскага філіяла.

Па выніках Рэспубліканскага конкурсу і рашэння журы на найвышэйшую прыступку п'едэстала гонару ўзнялася каманда Брэсцкага філіяла. Яна набрала найбольшую колькасць балаў па выніках тэарэтычных і практычных іспытаў, 2-е месца заняла каманда Віцебскага філіяла, 3-е месца — у каманды Гомельскага філіяла. Дарэчы, і ў мінулым годзе Брэсцкі філіял стаў пераможцам у прафесійным конкурсе.

— Утрымаць лідарства ўдалося дзякуючы таму, што на нашым філіяле выбудавана сістэма падрыхтоўкі кадраў, — адзначыла намеснік дырэктара Брэсцкага філіяла РУП «Белпошта» Ірына Кандрацюк. — Гэта сістэмная работа: правядзенне дзён якасці, складанне навучальных праграм, разнастайныя семінары, абмен вопытам і гэтак далей. Дзякуючы такой эфектыўнай падрыхтоўцы, супрацоўнікі нашага філіяла набываюць адпаведныя прафесійныя навыкі, якія з поспехам выкарыстоўваюць у сваёй штодзённай працы. Усё гэта, на мой асабісты погляд, і дае тыя самыя станоўчыя вынікі, якія дазволілі нам другі год запар перамагчы ў прафесійным конкурсе. А яшчэ дадам, што ў нашым Брэсцкім філіяле склалася сапраўдная каманда спецыялістаў высокага ўзроўню. Не будзем забываць і пра тое, што наша каманда выйшла на конкурс з настроем толькі на перамогу. І гэтую мэту мы дасягнулі!

А вось як пракаментавала вынікі конкурсу намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» па эксплуатацыйнай дзейнасці Алена Драздовіч:

— Адметнай рысай гэтага конкурсу стала тое, што вырашылі заснаваць новы прыз — сімпатый гледачоў, уладальнікамі якога сталі каманды вытворчасці «Мінская пошта» і Гомельскага філіяла. Мне, як старшыні журы, вельмі спадабалася, што на нашым прадпрыемстве працуе шмат таленавітых людзей, адданых сваёй нялёгкай прафесіі, адказных і добрасумленных. Прыемна, што ўсе каманды па ходзе конкурсу праявілі незвычайны артыстызм. А яшчэ хачу адзначыць велізарную працавітасць нашых супрацоўнікаў.

Кожнаму ўдзельніку конкурсу хачу пажадаць не спыняцца на дасягнутым, пастаянна ўдасканальвацца, асвойваць новае абсталяванне і тэхналогіі, актыўна выкарыстоўваць так званыя лічбавыя паслугі і, безумоўна, здароўя і новых поспехаў у працы, — дадала Алена Васільеўна.

**Фота з архіва РУП «Белпошта».**

# ПРАФЕСІЯ З ВЯЛІКАЙ ЛІТАРЫ

**Так лічыць супрацоўніца АПС № 63 г. Мінска Людміла АЛЯБ'ЕВА. Гаворачы аб сваёй спецыяльнасці, яна падкрэсліла, што прафесія паштальёна патрабуе такой жа адказнасці, добрасумленнасці і адданасці сваёй справе, як і прафесіі ўрача, міліцыянера альбо выратавальніка.**



Па сваёй асноўнай спецыяльнасці Людміла Аляксандраўна эканаміст. Дзесяць гадоў працавала менавіта ў гэтай якасці ў творчай галіне. А каля шасці гадоў таму вырашыла змяніць род дзейнасці і прыйшла працаваць на пошту. Прычыны такога кроку — неабходнасць падтрымліваць сябе ў добрай фізічнай форме, паспрабаваць сілы ў новай якасці, ну і каб работа была бліжэй да дому.

— На жаль, многія не ведаюць, наколькі праца паштальёна цяжкая, — падкрэсліла Людміла Аляб'ева. — Яна патрабуе не толькі прыкладаць пэўныя фізічныя сілы, каб своечасова абысці свой давалі немаленькі даставачны ўчастак пры любым надвор'і, але і быць дастаткова эрудзіраваным чалавекам, каб адказаць на любыя, у тым ліку і жыццёвыя, пытанні, з якімі да яе звяртаюцца спажыўцы паштовых паслуг.

По словах Людмілы Аляксандраўны, новую прафесію яна асвоіла даволі хутка. Падрабязна азнаёмілася з даставачным участкам на вуліцы Нёманскай, вывучыла Правілы аказання паслуг паштовай сувязі, прычым рабіла ўсё вельмі скрупулёзна. Новую супрацоўніцу добра сустрэлі ў новым працоўным калектыве. І з вопытнымі работнікамі, і з моладдзю ў Людмілы адразу склаліся добрыя ўзаемаадносіны.

У першы працоўны дзень адна з паштальёнаў правяла Людмілу па яе даставачным участку, азнаёміла з кварталамі, дзе будзе пралягаць маршрут дастаўкі карэспандэнцыі, пажадала поспехаў. А наступны раз Людміле давялося ісці ўжо ў адзіноце.

Спачатку, як адзначыла Людміла Аляксандраўна, было няпроста. Для чалавека, звыклага да працы з фінансавымі дакументамі, новыя ўмовы аказаліся некалькі нечаканымі. У першыя дні прамільгнула думка, што гэта праца не для яе. Але здавацца не ў яе традыцыях.

— Назіраючы за работай калег, я адзначыла, што ўсе яны ўмела і своечасова выконваюць свае службовыя абавязкі, — працягвае суразмоўніца. — Такім чынам, і я хутка змагу працаваць на іх узроўні.

Участак кожнага паштальёна налічвае парадку 30 шматкватэрных жылых дамоў без уліку арганізацый. Асаблівасці майго даставачнага ўчастка ў тым, што ён уключае пяціпавярховыя, дзевяціпавярховыя, вышынныя дамы і нават прыватны сектар. І кантынгент разнастайны, а значыцца, і падыход патрэбны адпаведны.

Трэба не проста адносіць і раскладваць паведамленні і карэспандэнцыю. Іншы раз неабходна падтрымаць чалавека, які апынуўся ў складанай жыццёвай сітуацыі. Напрыклад, як адна пенсіянерка на маім участку, якая нядаўна страціла мужа. У такім становішчы я проста не магла не падставіць жанчыне сваё плячо, дапамагчы, падтрымаць цёплым словам. Мне прыемна, што бабулькі, якія жывуць на маім участку, ставяцца да мяне як да дачкі.

Многія ўпэўнены, што самае цяжкае для паштальёна — моцны вецер, лівень, мароз ці снегапад. Але, на мой погляд, самае цяжкае — гэта перамагчы свой характар, максімальна прыстасавацца да работы з людзьмі. Гэта, скажу, была для мяне задача няпростая. Між іншым, ад умення працаваць з людзьмі напрамую залежыць якасць паслуг.

Як прызналася ў заканчэнні размовы Людміла Аляб'ева, пры магчымасці яна б з задавальненнем вярнулася ў творчую галіну, але тое, што існуе сёння, яе цалкам задавальняе. Вось і спяшаецца раніцай да жыхароў свайго даставачнага ўчастка з карэспандэнцыяй, а пасля заканчэння працы з пачуццём выкананага абавязку ідзе дамоў, дзе з нецярпеннем яе чакаюць трое любімых дзяцей...

**Фота аўтара.**

**Матэрыялы выпуску падрыхтаваў Сяргей РУЧАНАЎ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by** |
| **Продавец** | **ИП Малащенко Д.М., Брестская обл., Барановичский район, д. Ягодная, ул. Лесная, д. 92, УНП 200154945** |

**Предмет повторных электронных торгов, назначенных на 01.11.2022**

**ЛОТ № 1 – торговые помещения 10,1 и 7 кв. м** (инв. № 500/D-7094609 и 500/D-7101853).
Адрес**: г. Минск, ул. Уманская, д. 54, пом. 9, 23**

**Начальная цена лота № 1 (без НДС): 14 535,00 долл. США**

**ЛОТ № 2 – торговое помещение 29,1 кв. м** (инв. № 500/D-7101854).
Адрес**: г. Минск, ул. Уманская, д. 54, пом. 24**

**Начальная цена лота № 2 (без НДС): 24 735,00 долл. США**

Извещение о проведении предыдущих торгов опубликовано в газете «Звязда» 27.08.2022

**Дата и время начала и окончания электронных торгов по лотам №№ 1, 2: 01.11.2022 с 13.00 до 14.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки** на участие в торгах **принимаются по 31.10.2022 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Предмет электронных торгов, назначенных на 10.11.2022**
Месторасположение лотов №№ 3,4:
**Брестская обл., г. Барановичи, ул. Брестская, д. 279Г**

**ЛОТ № 3 – клуб 639,9 кв. м** (здание специализир. культурно-просветит. и (или) зрелищного назначения, инв. № 110/С-105788) с **водопроводом ввода 6,8 м** (инв. № 110/С-106551) **и сетью канализации 59,3 м** (инв. № 110/С-106560). ***Сведения о земельном участке*:** пл. 0,0998 га, предоставлен на праве аренды (срок действия по 08.07.2044) для размещения объектов иного назначения

**Начальная цена лота № 3 (без НДС): 89 938,00 долл. США**

**ЛОТ № 4 – казарма 2062,5 кв. м** (здание специализир. для органов гос. управления, обороны, гос. безопасности, внутрен. дел, инв. № 110/С-105789) **с водопроводом ввода 17,6 м** (инв. № 110/С-106552), **канализац. сетью 102,2 м** (инв. № 110/С-106596), **теплосетью 23,4 м** (сооружение специализированное коммунального хозяйства), инв. номер 110/С-106548). ***Сведения о земельном участке*:** пл. 0,1713 га предоставлен на праве аренды (срок действия по 08.07.2044) для размещения объектов иного назначения

**Начальная цена лота № 4 (без НДС): 130 659,00 долл. США**

**Дата и время начала и окончания электронных торгов по лотам №№ 3,4: 10.11.2022 с 13.00 до 14.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки** на участие в торгах **принимаются по 09.11.2022 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Примечание: цена продажи Предмета аукциона фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения аукциона*

Задаток **10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191 224 638

**Срок подписания договора купли-продажи и оплаты предмета электронных торгов: 3 (три)** рабочих дня после проведения электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом торговой площадки «ИПМ-Торги»: **www.ipmtorgi.by.** Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, штрафные санкции прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение по лотам №№ 1, 2 – 5 %, по лоту № 3 – 6 %, по лоту № 4 – 4 % от цены продажи лота в течение 3 дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя торгов без объяснения причин снятия

**Контактные телефоны: +375 29-317-95-42; +375 44 704-92-06.**
**E-mail: info@ipmtorgi.by**

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Авиакомпания Трансавиаэкспорт»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 09.11.2022 с 10.00 (по времени на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»)**

**Лот № 061022001:** Самолет ИЛ-76ТД EW-78839 (сер. № 7702) (без авиационных двигателей), 1990 г. в., инв. № 0031, заводской номер 1003402047. Место нахождения: г. Минск, территория Национального аэропорта «Минск». Начальная цена продажи без учета НДС – 660 000,00 долларов США. Задаток – 66 000,00 долларов США.

**Лот № 061022002:** Самолет ИЛ-76ТД EW-434ТН (сер. № 6810) (без авиационных двигателей), 1989 г. в., инв. № 1191, заводской номер 0093490718. Место нахождения: г. Могилев, территория Могилевского филиала республиканского унитарного предприятия по аэронавигационному обслуживанию воздушного движения «Белаэронавигация». Начальная цена продажи без учета НДС – 680 000,00 долларов США. Задаток – 68 000,00 долларов США.

Шаг электронных торгов – 5 %.
Штраф – 10 % от начальной цены.
Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП «ТОРГИБЕЛ» (http://торги.бел).
Задаток на участие в торгах устанавливается в долларах США.
Валюта платежа в счет перечисления задатка: для резидентов Республики Беларусь – белорусский рубль; для нерезидентов Республики Беларусь – российский рубль или белорусский рубль.

Расчетные счета для внесения задатков:
– в белорусских рублях: р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC банка BAPBBY2X;
– в российских рублях: р/с BY32BAPB30127802900200000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Список основных счетов «НОСТРО» ОАО «Белагропромбанк» размещен на сайте ЭТП «ТОРГИБЕЛ» (http://торги.бел).
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в электронных торгах 09.11.2022 (Лот № __).

Срок внесения задатка:
в рос. руб. – по 01.11.2022; в бел. руб. – по 04.11.2022 до 11.00.
Аккредитация, регистрация и участие в электронных торгах осуществляются на ЭТП «ТОРГИБЕЛ». Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами: **04.11.2022 в 12.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • www.торги.бел • e-mail: torgi@ino.by** УНП 190055182

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «Гомельский винодельческий завод»** (УНП 400051877) 246003, г. Гомель, ул. Рогачевская, 10, тел. +375 (232) 71-38-55 в лице антикризисного управляющего Костяна Дмитрия Александровича.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **24 октября 2022 г. 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Имущество филиала «Пиревичский спиртзавод» ОАО «Гомельский винодельческий завод», Гомельская обл., Жлобинский р-н, аг. Пиревичи, ул. Суворова, 4 А | 3 737 951,45 |
| 2 | Имущество филиала «Рогачевский» ОАО «Гомельский винодельческий завод», Гомельская обл., г. Рогачев, ул. Богатырева, 36 | 63 910,14 |
| 3 | Имущество филиала «Речицкий» ОАО «Гомельский винодельческий завод», Гомельская обл., г. Речица, ул. Винзаводская, 4 | 319 872,42 |
| 4 | Имущество филиала «Чечерский» ОАО «Гомельский винодельческий завод», Гомельская обл., г. Чечерск, ул. Советская, 72 А | 43 477,58 |

Подробнее с составом лотов можно ознакомится на сайте beltorgi.by. Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 08.10.2022 г. 09.00 по 21.10.2022 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 30 календарных дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов – возможна рассрочка в течение 90 календарных дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда», «Гомельская правда» от 20.08.2022 г.

Дэпартамент па каштоўных паперах Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь
ЗАРЭГІСТРАВАНА

УТВЕРЖДЕНО
Протокол внеочередного Общего собрания участников Общества с ограниченной ответственностью «Темпл Сити»
15 июля 2022 г. № 58

## ИЗМЕНЕНИЯ в проспект эмиссии облигаций третьего выпуска Общества с ограниченной ответственностью «Темпл Сити»

1. Подпункт 1.8.1. пункта 1.8. Проспекта эмиссии изложить в следующей редакции:
«1.8.1. Совет директоров (наблюдательный совет) у Эмитента не избирался.»
2. Подпункт 1.9.1. пункта 1.9. Проспекта эмиссии изложить в следующей редакции:
«1.9.1. Участники Эмитента:

| | |
|---|---|
| 1. Павлиш Игорь Иванович | |
| Все занимаемые должности, в том числе вне органов управления Эмитента, в настоящее время – заместитель директора по развитию ООО «Медицинский центр ТОМОГРАФИЯ» | |
| Размер доли в уставном фонде Эмитента | 76 % |
| ЮНИВЕРСАЛ ЭНТЕРПРАЙЗ ЭНД ИНВЕСТМЕНТ Л.П. («UNIVERSAL ENTERPRISE & INVESTMENT L.P.») – партнерство с ограниченной ответственностью, юридическое лицо, созданное и осуществляющее свою деятельность в соответствии с законодательством Шотландии, Великобритании, зарегистрированное 21 августа 2012 г. Регистратором партнерств с ограниченной ответственностью под номером партнерства SL011191 в Эдинбурге, Шотландия | |
| Основное место осуществления деятельности: Великобритания, Грантон – Кресент, 39/5, Эдинбург, EH5 1BN. | |
| Размер доли в уставном фонде Эмитента | 24 % |

.»

Директор ООО «Темпл Сити» — А.Л.Солонович

Индивидуальный предприниматель Столяр Ольга Ивановна (оказание услуг по ведению бухгалтерского и налогового учёта ООО «Темпл Сити») — О.И.Столяр

Директор ООО «ФБК-Оценка» — Н.К.Затылкин

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Общества с ограниченной ответственностью «Магазин № 43 «Мужская одежда» (продавец, УНП 400072083) извещает о проведении 25 октября 2022 года открытого повторного аукциона со снижением цены по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Изолированное помещение с инв. № 320/D-20377**, **площадью 691,3 кв. м**, назначение – торговое помещение, наименование – **встроенное в пятиэтажный кирпичный жилой дом помещение магазина № 43 «Мужская одежда» на 22 рабочих места.** **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Урицкого, д. 88, пом. 4А | **1 500 000,00** | 75 000,00 |

**Продавец:** Общество с ограниченной ответственностью «Магазин № 43 «Мужская одежда», 247197, г. Жлобин, ул. Урицкого, д. 88, помещение 4А.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (029) 620-96-61 – директор Федорова Татьяна Петровна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца имущества (ООО «Магазин №43 «Мужская одежда»):** УНП 400072083, р/с BY43 BLBB 3012 0400 0720 8300 1001 в ОАО «Белинвестбанк» г. Жлобин, ул. Петровского, 42, БИК BLBBBY2X, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**.

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 8 октября 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 21 октября 2022 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) календарных дня до его проведения.**

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом имущества** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **20 (двадцати) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи, **возможность рассрочки платежа на 4 (четыре) месяца**.

Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 26.07.2022 г. № 144 (29766).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-53, 8 (029) 651-22-19, 8 (044) 599-18-16.**

Дэпартамент па каштоўных паперах Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь
ЗАРЭГІСТРАВАНА

УТВЕРЖДЕНО
Протокол внеочередного Общего собрания участников Общества с ограниченной ответственностью «Темпл Сити»
15 июля 2022 г. № 58

## ИЗМЕНЕНИЯ в проспект эмиссии облигаций четвёртого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «Темпл Сити»

1. Подпункт 1.9.2. пункта 1.9. Проспекта эмиссии изложить в следующей редакции:
«1.9.2. Сведения о членах Наблюдательного совета.
Наблюдательный совет у Эмитента не избирался.»
2. Подпункт 1.11.2. пункта 1.11. Проспекта эмиссии изложить в следующей редакции:
«1.11.2. Павлиш Игорь Иванович. Все занимаемые должности, в том числе вне органов управления Эмитента – заместитель директора по развитию ООО «Медицинский центр ТОМОГРАФИЯ», член наблюдательного совета ООО «Медицинский центр ТОМОГРАФИЯ».
Доля в уставном фонде Эмитента – 76 %. Долей в уставных фондах зависимых и дочерних хозяйственных обществ Эмитента не имеет.»

Директор ООО «Темпл Сити» — А.Л.Солонович

Индивидуальный предприниматель Столяр Ольга Ивановна (оказание услуг по ведению бухгалтерского и налогового учёта ООО «Темпл Сити») — О.И.Столяр

Директор ООО «ФБК-Оценка» — Н.К.Затылкин

# ЛОНДАН, ГУД БАЙ

## Што адбываецца ў Вялікабрытаніі?

**Рэйтынгавае агенцтва Fitch панізіла прагноз па крэдытным рэйтынгу брытанскага дзяржаўнага доўгу са стабільнага да негатыўнага. Пра гэта паведаміла Reuters. «Вялікі і незабяспечаны бюджэтны пакет мер новага ўрада, абвешчаны як частка плана росту, можа прывесці да павелічэння бюджэтнага дэфіцыту ў сярэднетэрміновай перспектыве», — пракаментавалі сваё рашэнне ў Fitch. У прыватнасці, агенцтва прагназуе, што дэфіцыт дзяржаўнага бюджэту Вялікабрытаніі сёлета дасягне 7,8 працэнта ад валавога ўнутранага прадукту і 8,8 працэнта — у 2023-м годзе. Нядаўна пра адпаведнае паніжэнне заявіла агенцтва Standard & Poor's. Прагнозы былі зменены ў горшы бок пасля фінансавай справаздачы ўрада. Брытанская эканоміка перажывае моцны крызіс, а ўрад страціў кантроль над ёй, заўважыў The Economist. Разгортваюцца і маштабныя сацыяльныя ўзрушэнні, якія, перш за ўсё, выкліканы небывалым за многія дзясяцігоддзі ростам цэн і няздольнасцю ўлад выправіць сітуацыю. Што ж адбываецца ў Вялікабрытаніі, чаго чакаць далей?**



### Каля прорвы

Яшчэ нядаўна Брытанія славілася развітай эканомікай. Фунт быў знакавай валютай, а ў новага кіраўніка Ліз Трас з'явіўся свежы двухгадовы мандат на кіраванне краінай. Прайшоў тыдзень, і краіна апынулася ў палітычным і фінансавым крызісе. Ліз Трас паспрабавала зваліць усё на Уладзіміра Пуціна, але не атрымалася, адзначыла «Бі-бі-сі». Супраць кіраўніка настроіліся ўсе: выбаршчыкі, эканамісты, міжнародныя фінансавыя арганізацыі, саюзнікі ў ЗША і Еўропе, яе ўласная партыя і нават міністры ўрада, сабранага менш чым за месяц.

Віной таму план радыкальных эканамічных рэформ і каласальных дадатковых бюджэтных выдаткаў на чвэрць трыльёна фунтаў, не падмацаваных ні новымі даходамі, ні мандатам ад выбаршчыкаў, ні нават незалежнай ацэнкай яго рэалістычнасці. План тут жа спачатку абрынуў рынак дзярждоўгу і курс фунта, а пасля і рэйтынгі кіруючай Кансерватыўнай партыі. Пенсіённая сістэма апынулася на мяжы краху, і цэнтрабанку прыйшлося ўключыць на поўную моц друкарскі станок, каб прадухіліць сістэмны крызіс, падтрымаць урад і выратаваць пенсійны фонд.

Многія брытанцы апынуліся перад пагрозай страціць жыллё і працу, пазбавіцца часткі пенсіі і доступу да бясплатнай аховы здароўя. А фінансісты ўсяго свету пачалі адмаўляцца ад некалі высакакласных актываў, і іх кошт упаў на ўзровень праблемных краін. Умяшанне Банка Англіі крыху супакоіла рынкі, аднак часова, паколькі крызіс нікуды не падзеўся, заўважыла «Бі-бі-сі». Трас і міністр фінансаў Квазі Квартэнг стаяць на сваім, нягледзячы на шквал прэтэнзій і змрочных прагнозаў. Гэты «дуэт» адказвае, што іх рэформы дазволяць брытанскай эканоміцы паскорыцца і ў выніку выйграюць усе. «Я гатова да цяжкіх рашэнняў, можаце разлічваць на мяне. Статус-кво — не варыянт», — дадала Трас, чым знервавала тых, хто ўпэўнены, што грошы на зніжэнне падаткаў урад збіраецца знайсці за кошт чарговага ўразання сацыяльных выдаткаў.

Секвестр бюджэту пагражае далейшым пашырэннем прорвы паміж багатымі і беднымі, падзеннем стандартаў у бальніцах, школах і ў бюджэтнай сферы ў цэлым. Трас называе свой план стратэгіяй росту. Зніжэнне падаткаў і дэрэгуляванне, па задумы яе паплечнікаў, павысіць зацікаўленасць інвестыцый у брытанскую эканоміку. Яна вырасце, казна напоўніцца — і ўсе зажывуць лепш. Аднак эканамісты не вераць у цуд. Яны ў адзін голас прадракаюць правал плана Трас—Квартэнга, а таксама прагназуюць імклівае падзенне ўзроўню жыцця насельніцтва Брытаніі і доўгія гады застою другой пасля Германіі найбуйнейшай эканомікі Еўропы.

### Фунт у піке

Цяперашні прэм'ер-міністр прыйшла да ўлады праз рашэнне кіруючай партыі, а не народа. Папярэдні кіраўнік Барыс Джонсан захлусіўся да адстаўкі. Спачатку Трас абяцала адпапартыйцам знізіць падаткі, урэзаць сацыяльныя выдаткі і адрэгуляваць эканоміку. Аднак рэаліі энергетычнага крызісу прымусілі яе перагледзець ранейшы лозунг «ніякіх падачак» і пагадзіцца выпісаць насельніцтву датацыю на святло і цяпло, яна абыдзецца казне ў 150 мільярдаў фунтаў у найбліжэйшыя два гады.

Нягледзячы на такі гіганцкі ўсплёск выдаткаў, Трас не адмовілася ад ранейшых затратных ідэй і прапанавала радыкальна знізіць падаткі — на 45 мільярдаў фунтаў у год. Больш за іншых ад яе плана выйгравалі найбагацейшыя, што абурыла апазіцыю і выбаршчыкаў. Але рынкі і інвестары знерваваліся з іншай нагоды. У бюджэце з'явілася новыя выдаткі. Аднак ніякіх новых спосабаў сабраць дадатковыя даходы міністр фінансаў Квартэнг не прад'явіў. Ён паабяцаў гэта зрабіць напрыканцы лістапада.

А пакуль што паведамілі: усё будзе прафінансавана ў доўг, для чаго давядзецца заняць 160 мільярдаў фунтаў на пяць гадоў. Пры гэтым спецпадатак на звышпрыбытак энергетычных кампаній, якія зарабілі на рэкордных цэнах на святло і цяпло, Трас з Квартэнгам збіраць адмаўляюцца, нягледзячы на заклікі апазіцыі і агульнаеўрапейскую практыку.

Планы ўрада актыўна займаць ва ўмовах узрослых ставак і адмаўляцца ад даходаў у разліку на паскарэнне эканамічнага росту за кошт зніжэння падаткаў і дэрэгулявання выклікаюць у эканамістаў і фінансістаў сумненні ў будучыні брытанскай эканомікі. Іх мог бы развеяць незалежны аўдытар OBR. Ён традыцыйна суправаджае любыя бюджэтныя пачынанні ўрада праз прагноз іх наступстваў. Аднак на гэты раз міністр Квартэнг забараніў публікацыю.

Вынік усіх пачынанняў новага ўрада не прымусіў сябе доўга чакаць. Разгарнуўся небывалы крызіс. Рынак дзярждоўгу перажыў гістарычнае падзенне, што прымусіла цэнтрабанк умяшацца і надрукаваць 65 мільярдаў фунтаў для скупкі дзяржаблігацый, якія сталі нікому не патрэбнымі. Фунт абваліўся амаль да парытэту з доларам, тады як за тыдзень да гэтага каштаваў $1,14, мінулай зімой — $1,35, а да рэферэндуму аб выхадзе з ЕС у 2016 годзе — $1,5.

### Адзін боль, карысці — нуль

Ніхто не паверыў, што Трас і Квартэнг знайшлі і трымаюць у сакрэце простае вырашэнне складаных праблем, да якога да іх ніхто не дадумаўся. Замест Нобеля па эканоміцы тандэм атрымаў шмат крытыкі глабальнага маштабу. «Вялікабрытанія паводзіць сябе, як рынак, што развіваецца, і імкнецца стаць недаразвітым», — заўважыў былы міністр фінансаў ЗША Лары Самэрс. Нават традыцыйна стрыманыя каментатары губляюць цярпенне. «Адзіны тып лідара для Брытаніі небяспечнейшы за папярэдняга дзівацкага (Джонсана) — гэта цяперашні фанатычны. Дамінуючая характарыстыка фанатыка — перакананасць у тым, што рэальнасць павінна падладжвацца пад іх жаданні а не наадварот, — напісаў адзін з вядучых сусветных фінансавых журналістаў Марцін Вульф у газеце Financial Times. — Гэта дрэнныя і небяспечныя людзі. Яны не ў сабе». А амерыканскі эканаміст, лаўрэат Нобелеўскай прэміі Пол Кругман адзначыў у Twitter, што «трасаноміка» гранічна дурная». У The Guardian з'явіліся адразу некалькі калонак з красамоўнымі загалоўкамі: «Трасаноміка падзіцячаму дурная, трасапалітыка — яшчэ горшая»; «Гэта крызіс Трас і Квартэнга, а не ваш, але вы ўжо бяднейшыя дзякуючы ім». А The Financial Times апублікавала артыкул «План урада Вялікабрытаніі — гэта адначасова дрэнная эканоміка і страчаная магчымасць».

Калі Трас месяц таму стала прэм'ерам, яна сказала Бі-бі-сі, што гатовая быць непапулярнай. У яе атрымалася. Рэйтынг Трас у першыя дні кастрычніка паваліўся да мінус 59 працэнтаў. Гэта не толькі глыбей за дно кар'еры Барыса Джонсана (мінус 53 працэнты — у ліпені перад адстаўкай), але нават горш за самы дрэнны рэйтынг непапулярнага папярэдняга лідара апазіцыі Джэрэмі Корбіна (мінус 55 працэнтаў). Паводле апытання кампаніі YouGov, праведзенага 1-2 кастрычніка, толькі 14 працэнтаў брытанцаў станоўча адклікаліся аб Трас, а 73 працэнты прытрымліваліся супрацьлеглага меркавання. На графіцы траекторыя яе рэйтынгу нагадвае безнадзейнае піке. «Каб аднавіць давер, ураду давядзецца зрабіць выбар паміж дрэнным і жудасным», — папярэджваюць эканамісты з Інстытута Тоні Блэра і Oxford Economics. Яны ацанілі наступствы прапанаванага Трас бюджэтнага плана і выпусцілі прагноз пад назвай «Адна боль, карысці — нуль». Эканамісты падлічылі, што абяцанага Трас і Квартэнгам росту эканомікі на 2,5 працэнта чакаць не варта, у лепшым выпадку яна дадасць нязначныя 0,4 працэнта.

Пры Джонсане рэпутацыя кансерватараў як прыхільнікаў узважанай эканамічнай палітыкі пахіснулася. Трас дабіла яе. Каб не апустошыць краіну, ёй давядзецца выбіраць — здзяйсняць палітычнае самагубства і адмаўляцца ад абвешчаных рэформаў ці рэзаць сацыяльныя выдаткі і рыхтавацца да палітычнай смерці ад рук угневаных выбаршчыкаў. Тым часам апазіцыя б'е трывогу і патрабуе тэрмінова склікаць парламент, які з 23 верасня па 11 кастрычніка знаходзіцца на традыцыйных для гэтага часу канікулах, адведзеных пад арганізацыю партыйных з'ездаў. Калі перапынак працягнецца, як і было запланавана, дэпутаты яшчэ некалькі дзён не змогуць заклікаць міністраў да адказу і аспрэчыць план урада. Па словах лідара Лейбарысцкай партыі Кіра Стармера, Ліз Трас — гэта пагроза нацыянальнай эканоміцы, а ўрад «гуляе на грошы» брытанцаў.

### Галодныя дзеці ядуць гумкі

Вынік дзеянняў брытанскіх улад не прымусіць сябе доўга чакаць. Рэальныя даходы насельніцтва імкліва змяншаюцца. Паводле прагнозаў Банка Англіі, грамадзянам свеціць найбуйнейшае падзенне ўзроўню жыцця за 60-гадовую гісторыю. У Вялікабрытаніі назіраецца імклівы рост галадаючых. Трывогу б'юць школы і дабрачынныя арганізацыі. Эканамічны крызіс у краіне штурхае людзей на жорсткі выбар — абагрэць свае дамы ці купіць дзецям ежу. Зіма яшчэ не наступіла, а брытанцы ўжо вымушаны выбіраць паміж уключэннем ацяплення і пакупкай ежы. Дырэктары школ Вялікабрытаніі б'юць трывогу: дзеці настолькі галодныя, што грызуць канцтавары ці падчас абеду хаваюцца на гульнявой пляцоўцы, саромеючыся таго, што не прынеслі ежу.

У дабрачыннай арганізацыі здаровага харчавання Chefs in Schools, якая навучае повараў для школьных кухняў, расказваюць, што сітуацыя з галадаючымі дзецьмі назіраецца ў многіх брытанскіх школах. У Chefs in Schools распавялі, што ў адной са школ на паўднёвым усходзе Лондана хлопчык прынёс пусты ланч-бокс і прыкідваўся, што есць з яго. Ён не меў права на бясплатнае школьнае харчаванне і не хацеў, каб ягоныя сябры ведалі, што ён вымушаны галадаць. «Мы чуем пра дзяцей, якія настолькі галодны, што ядуць гумкі ў школе, — распавяла Наомі Дункан, выканаўчы дырэктар Chefs in Schools. — Прыходзяць дзеці, якія нічога не елі з абеду мінулага дня. Урад павінен нешта з гэтым рабіць». У Вялікабрытаніі права на бясплатнае школьнае харчаванне маюць дзеці толькі малодшага школьнага ўзросту, а таксама дзеці з сем'яў з нізкім даходам. Астатнія павінны плаціць за абеды. У выніку атрымліваецца, што 800 тысяч дзяцей не атрымліваюць бясплатных абедаў у школе.

Дапамагчы людзям імкнуцца дабрачынныя арганізацыі. Аднак тых, хто мае патрэбу ў дапамозе, так шмат, што яе ўжо недастаткова. Грамадскія групы паведамілі The Guardian, што яны імкнуцца справіцца з попытам на бясплатныя прадукты з боку сем'яў, нядзольных пракарміць сваіх дзяцей. «Крызіс ужо надышоў», — заявіў Крэйг Джонсан, заснавальнік дабрачыннай арганізацыі Launch Foods у Глазга, якая прадстаўляе бясплатныя абеды для школьнікаў. «Я так хвалююся, кажучы людзям, што мы не можам ім дапамагчы, — сказаў Джонсан. — Дзіця не павінна галадаць».

Мішэль Дарнэлі, заснавальніца Children with Voices — дабрачыннай арганізацыі, якая бясплатна раздае ежу сем'ям на ўсходзе Лондана, заявіла, што валанцёры з усіх сіл спрабуюць справіцца з ростам маючых патрэбу. Апроч таго, што дзеці рэгулярна кладуцца спаць галоднымі, яны сутыкаюцца з псіхалагічнымі праблемамі. Дарнэлі таксама кажа аб бяздзейнасці брытанскіх улад у дадзенай сітуацыі: «Дэпутатам трэба прайсціся па вуліцах і даведацца, што адбываецца».

Імклівы развал эканомікі, які зараз перажывае Вялікабрытанія, — паскораная версія таго, праз што ў бліжэйшы час давядзецца сутыкнуцца ўсёй Еўропе, адзначыў брытанскі часопіс The Spectator. Як заўважыла эканаміст Таццяна Кулікова з gazeta-pravda.ru, гэта пачатак канца сусветнай фінансавай сістэмы. «Насамрэч эканамічная праграма Ліз Трас — гэта дадатковы фактар, які пагаршае і без таго напружаную сітуацыю, яго з'яўленне стала толькі спускавым кручком, які спракакаваў абвал, — лічыць эксперт. — У сусветнай фінансавай сістэме з'яўляецца ўсё больш месяцаў, напружанне ў якіх вось-вось прарвецца».

**Захар БУРАК.**



# Вогненныя вёскі. Нельга забыць

## Памяці спаленых фашыстамі паселішчаў прысвячаецца



# ГОРКІЯ ЛЁСЫ

## Вёскі Гродзенскага раёна, якіх аб'яднала трагедыя

**На тэрыторыі Гродзенскага раёна фашысты правялі некалькі карных аперацый супраць мірных жыхароў. Летам 1943 года пераўтварылі ў папялішча вёску Пузавічы, дзе загінула больш за паўтысячы чалавек. Былі спалены і зруйнаваны вёскі Сіні Камень, Шкленск, Полымя. Расправы над мірным насельніцтвам адбыліся ў Бабіне, Запур'і, Залясянах, Горніцы, Кашубінцах, Ятвезі... Фашысты помсцілі вяскоўцам за тое, што не могуць адолець партызан, і рабілі гэта з нечалавечай жорсткасцю. Сёння на тых месцах стаяць помнікі.**

### ВАХТА ПАМЯЦІ

За тры гады акупацыі загінулі звыш 36 тысяч жыхароў Гродзенскага раёна. Цяпер у населеных пунктах каля помнікаў ахвярам фашызму вядзецца ўстаноўка візуальных формаў камунікацый з QR-кодамі. Ужо з'явілася больш за 20 такіх таблічак, і гэта работа працягваецца, паведамілі ў Гродзенскім райвыканкаме. Зараз пачалася распрацоўка патрыятычных маршрутаў па месцах былых трагедый. Дарога да іх не забыта. Помнікі і абеліскі даглядаюць школьнікі, прадстаўнікі мясцовай улады, грамадскіх арганізацый.

Нядаўна свой маршрут па месцах масавых расстрэлаў жыхароў і спаленых вёсках праклала Гродзенская раённая арганізацыя Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане. Яе старшыня Аляксандр Даніловіч арганізаваў экспедыцыю памяці, удзельнікамі якой сталі школьнікі, прадстаўнікі вытворчага прадпрыемства «Агракамбінат «Скідзельскі», салютны ўзвод пагранічнікаў, ветэранскія арганізацыі.

— Мы ўпершыню праводзім акцыю «Вахта памяці па спаленых вёсках Гродзенскага раёна». Я сам з дзяцінства памятаю гэтыя вёскі, бо родам адсюль. Бліжэй усяго да маёй малой радзімы знаходзіцца вёска Бабіна, якую немцы амаль што зруйнавалі з зямлёй, таксама недалёка Полымя ці Дземша, як называлі вёску самі жыхары, — расказаў Аляксандр Даніловіч. — Пра многія малыя населеныя пункты мала хто ведае, звычайна праводзілі такія вахты памяці ў Скідзелі і вёсцы Партызанская. Але я вырашыў пашырыць маршрут. Бо такіх месцаў у Гродзенскім раёне нямала.

Кіраўнік грамадскай арганізацыі мае намер і надалей працягваць такія вахты памяці па спаленых вёсках. Ён лічыць, што важна знаёміць дзяцей з гэтымі мясцінамі: не зусім малых, а сярэдняга і старэйшага ўзросту, якія больш усведамляюць факты і расказы. На яго думку, вельмі важна, што гэта тэма ўзнята на шырокі грамадскі ўзровень. Бо раней аб зверствах ворагаў ведалі ў асноўным мясцовыя жыхары. Але трэба, каб і ўсе ведалі, якія жахі тварылі фашысты з мірным насельніцтвам.

### ВЁСКА БАБІНА Ў МЕМУАРАХ

У вёсцы Бабіна ўдзельнікі экспедыцыі сустрэліся з цікавым чалавекам, навукоўцам, доктарам філалагічных навук, прафесарам Мікалаем Даніловічам. Ён аўтар шматлікіх навуковых работ, даследуе мову і дыялекты Гродзеншчыны. Некалькі месяцаў таму ён выдаў новы твор, які прысвечаны яго роднай вёсцы Бабіна. Мікалай Аляксандравіч прызнаўся, што тут яго бацькоўская хата, і напісаць гэты аповед было яго доўгам. Зараз амаль ніхто не можа расказаць трагічную гісторыю партызанскай вёскі. Каштоўныя звесткі ён збіраў літаральна па крупіцах. З дзяцінства слухаў расказы аднавяскоўцаў, якія прыходзілі на вячоркі і ўспаміналі былыя часы. Вельмі часта ішла гаворка пра ваеннае ліхалецце. Тады проста запамінаў. А збіраць матэрыял для кнігі пачаў гадоў 20 таму.

— Вельмі шкадаваў, чаму раней не запісваў успаміны людзей. Яшчэ заставаліся сведкі той жудаснай трагедыі, — расказвае аўтар. — Я пачаў актыўна з імі супрацоўнічаць, распытваць, запісваць. З тымі, хто жыў далёка, у Расіі, зладзіў перапіску. Запісваў на дыктафон — у мяне запісана жывая мова гэтых людзей. Таксама збіраў фотаздымкі жудаснай гісторыі. Чатыры гады таму пачаў пісаць. Скончыў гэтым летам, і кніга «Мая родная вёска Бабіна» выйшла невялікім тыражом, усяго 50 экзэмпляраў.

З сабраных успамінаў можна даведацца аб трагедыі, якая здарылася ў вёсцы зімой 1943 года. Вось кароткі пераказ тых падзей.




...Фашысты пачалі аперацыю напярэдадні новага года — 31 снежня 1942 года. Іх мэтай было знішчэнне партызан, якія ўкрываліся ў Святым балоце каля вёскі. Немцы ішлі дзвюма групамі. Атрымалася так, што абедзве пачалі страляць адна ў другую. Партызанам удалося збегчы, а немцы паранілі свайго салдата, які хутка памёр. Яны вырашылі абвінаваціць у яго смерці партызан. Нямецкі ўказ абвяшчаў: за аднаго забітага немца караць смерцю дзесяць мясцовых жыхароў.

У Бабіне адчувалі, што набліжаецца нешта жудаснае: немцы хадзілі па хатах, усё аглядалі. Калі ў іх спыталі, што яны шукаюць, солтыс адказаў: хату пад кіно. Маўляў, у Бабіне яно будзе ранкам.

Магчыма, летам людзі і паўцякалі б у лес, але была зіма, холад. Партызанскі лагер немцы развалілі. Ды не думалі тады вяскоўцы, што з імі так жорстка абыдуцца. Тады ў акрузе яшчэ не было падобнай практыкі ліквідацыі вёсак. Бабіна стала першай ахвярай.

*Мікалай Даніловіч падрабязна апісвае, як усіх жыхароў вёскі сагналі ў адзін дом і падзялілі на тры групы. Агучылі спіс і павялі на расстрэл. Наперадзе ішла жонка забітага немца, каб бачыць акт помсты. Выводзілі па двое, потым чуліся стрэлы. Сярод сабраных немцамі вяскоўцаў аказаўся прадзед Мікалая Данілавіча з унучкай Марыяй, сястрой маці аўтара кнігі. З прадзедам у пары ішоў паляўнічы, якому ўдалося ўцячы. Немцы былі разгубленыя, але жонка забітага немца падказала: няхай за бацьку будзе яго сын. А паколькі сын паляўнічага быў непаўналетні, то і замена быццам няроўная. Тады вырашылі ўзяць двух падлеткаў, сына паляўнічага і суседскага хлопчыка. Аднаму было 13, другому 11 гадоў. Далёка не адводзілі — застрэлілі абодвух у метрах 50 ад хаты. Такім чынам замест дзесяці былі забіты адзінаццаць вяскоўцаў. Астатніх мужчын адправілі ў канцлагер і потым знішчылі, жанчын — на работы ў Германію. Дзяцей, ухапіўшы за рукі, выкідалі ў снег. Іх забралі жыхары навакольных вёсак.*







Аўтару кнігі давялося азнаёміцца з дакументам аб выкананні аперацыі, які склаў тагачасны начальнік жандарскага ўчастка на імя гродзенскага каменданта паліцыі і СД. Дакумент на нямецкай мове захоўваецца ў Дзяржаўным архіве Гродзенскай вобласці. У ім сітуацыя падаецца з неверагодным цынізмам. У дакуменце гаворыцца, што жыхароў сабралі разам з рэчамі для таго, каб перасяліць з вёскі, бо яны дапамагаюць партызанам. Але раптам 12 чалавек паспрабавалі ўцячы. Яны былі забіты. Жандар піша, што гэтыя людзі былі звязаныя з партызанамі. Яшчэ 11 чалавек, якія падазраюцца «ў супрацоўніцтве з бандытамі», арыштаваны і перададзены ў канцлагер.

Пасля расправы над жыхарамі нямецкае начальства загадала зруйнаваць Бабіна. Ставілася задача сцерці яе з твару зямлі. Удалося ўратаваць чатыры дамы (іх гаспадары, якіх выселілі ў суседнюю вёску, закалолі парсюка і адвезлі нямецкаму начальству). Але жыць у дамах не дазвалялася.

Пасля вайны выжыўшыя жыхары вярнуліся, у тым ліку і Галіна Кузьмінічна — маці Мікалая Даніловіча. Яна ў вайну засталася адна — усіх яе братоў, сясцёр, бацьку знішчылі немцы. А яе спачатку адправілі ў турму, а затым у Германію. Калі вярнулася ў вёску, тут нічога не было. Адбудаваць Бабіна не ўдалося, і гэты боль страты жанчына пранесла праз усё жыццё. Лічыла сваім абавязкам паклапаціцца аб устаноўцы помніка. Ён добра бачны з вокнаў бацькоўскага дома Мікалая Аляксандравіча. На помніку 12 імёнаў і ўсяго два прозвішчы — Янковіч і Хоха.

— Маці даглядала брацкую магілу да апошніх дзён, купляла кветкі са сваёй пенсіі. Мы побач паставілі лаўку, на якой яна доўга сядзела вечарамі і малілася, — расказвае Мікалай Аляксандравіч. — Цяпер тут амаль нікога не засталося, але за помнікам ёсць догляд. Сёлета, клопатамі старшыні Парэцкага сельвыканкама Андрэя Мацкевіча, тут правялі дасканалы рамонт. Замянілі магільную пліту, агароджу, выклалі плітку, зрабілі сходкі. Пафарбавалі, надпісы аднавілі. Мясцовыя ўлады сочаць за парадкам: трава заўсёды падкошана.

### ПАРТЫЗАНСКАЯ ВЁСКА НА МЕСЦЫ ПАПЯЛІШЧА

Бадай самы трагічны лёс падчас вайны напаткаў Пузавічы. Такога населенага пункта няма на сучасных картах. Ён знік у ліпені 1943 года, калі вораг пераўтварыў сотні дамоў у суцэльнае папялішча, а жыхароў паклаў у агульную магілу.

*Нагодай для карнай аперацыі сталі разабраныя рэйкі на чыгунцы, непадалёку ад Скідзеля. На другі дзень ранкам фашысты з усіх бакоў акружылі Пузавічы. Па ўспамінах скідзельчанкі Любові Серкінай, немцы хадзілі па дамах і выганялі людзей быццам бы на сход. Жанчын з дзецьмі зачынілі ў адзін хлеў, мужчын — у другі. Загадзя сабралі з наваколля людзей з павозкамі і рыдлёўкамі. Потым сталі вяскоўцаў выводзіць па дваццаць чалавек. Загадвалі скакаць у яму і стралялі з кулямёта. У калектыўнай магілы на тры дні паставілі ахову, каб ніхто не мог выратавацца. У гэтай бойні загінула сястра Любові Серкінай, яе муж і двое дзяцей дзевяці і чатырох гадоў.*

*Немцы вывезлі ўсю маёмасць, забралі хатніх жывёл, а потым вёску ўшчэнт спалілі.*

*Але і гэтага фашыстам было мала. У кнізе «Памяць. Гродзенскі раён» ёсць даныя, што ў 1944 годзе пры адступленні акупанты сталі замятаць сляды сваіх зверстваў — у Пузавічах разрылі магілы, аблілі астанкі людзей палівам, абклалі дровамі і падпалілі. Такім чынам, вёску спалілі двойчы...*



Калі пасля вызвалення пачаўся збор інфармацыі аб карных экспедыцыях фашыстаў у Пузавічах, Дземшы, Сінем Камяні і Шкленску, аказалася вельмі цяжка ўстанавіць колькасць загінулых жыхароў. Дапамаглі жывыя сведкі. Многія ўспаміны, дарэчы, увайшлі ў двухтомнік «Галасы дзяцей вайны», які выдадзены раённай жаночай арганізацыяй «Надзея» пры падтрымцы Гродзенскага райвыканкама.

Вялікую работу па зборы матэрыялу правёў Васіль Казак, які доўгі час працаваў старшынёй Скідзельскага сельвыканкама, а зараз узначальвае гарадскую ветэранскую арганізацыю.

— Мы ўдакладнілі лічбу, і аказалася, што загінулых 488 чалавек, гэта амаль усе жыхары даваенных Пузавічаў, — расказаў Васіль Рыгоравіч, — мы працавалі ў архівах, размаўлялі з людзьмі, сведкамі тых падзей. Але назваць усіх загінулых жыхароў пайменна так і не змаглі. Таму ў кнізе «Памяць» ёсць такія запісы: «У спісе названы 16 дзяцей з прозвішчам Быцкевіч, у тым ліку дзесяць хлопчыкаў і шэсць дзяўчынак. Імёны і ўзрост невядомыя». Не ўстаноўлены прозвішчы яшчэ 83 загінулых жыхароў вёскі.



Цяжкасць у вызначэнні імёнаў яшчэ і ў тым, што карная аперацыя праводзілася на другі дзень вялікага рэлігійнага свята, на які да жыхароў Пузавіч з'ехалася нямала радні. Яны таксама маглі трапіць у смяротную пастку. Пузавічы так і не адрадзіліся. На іх месцы ўзнікла вёска з новай назвай — Партызанская. Напачатку 60-х на месцы расправы над мірнымі жыхарамі з'явіўся мемарыял у выглядзе самотнай жаночай постаці, а побач — памятная пліта над двума магіламі. Некалькі гадоў таму помнік аднавілі, паклалі тратуарную плітку, абсталявалі пляцоўку для мітынгаў, пасадзілі блакітныя яліны.

### ЧОРНЫ ЛІПЕНЬ 43-га

Праз тры дні пасля трагедыі ў Пузавічах, 18 ліпеня, у Гродзенскім раёне былі знішчаны разам з жыхарамі адразу тры вёскі — Шкленск, Сіні Камень і Полымя. Яны, як і ўсе іншыя, мелі цесныя кантакты з партызанамі, дапамагалі ім, пяклі хлеб, мылі бялізну. Таму немцы распраўляліся з жыхарамі асабліва бязлітасна. У кожнай вёсцы загінула ад 40 да 80 чалавек.

У Шкленску фашысты спалілі ўсе 17 падворкаў, а 68 жыхароў расстралялі, у тым ліку 38 дзяцей. На месцы трагедыі ўстаноўлены памятны абеліск, які ў 1956 годзе выканаў архітэктар Макар Гардзей, ураджэнец вёскі. У агульнай магіле пахаваны 79 жыхароў, якія загінулі ад рук фашыстаў.

У гэты ж дзень карная аперацыя прайшла ў маленькай вёсцы Полымя, дзе было сем дамоў і каля 40 жыхароў. Амаль усе яны насілі прозвішча Дземша, таму так часцей за ўсе называлі і саму вёску. Так напісана і на помніку, які пасля вайны быў усталяваны на месцы масавага расстрэлу. Цудам выратаваўся Аляксандр Дземша, які заначаваў у цешчы ў суседняй Дубінцы. Яго жонка і малое дзіця загінулі. У памяць аб іх ён вярнуўся ў спаленую вёску, пабудаваў сабе хату і пражыў астатак свайго жыцця ў адзіноце. Вёска так і не адрадзілася.

Няма на карце і населенага пункта з прыгожай назвай Сіні Камень. І тут акупанты дзейнічалі па сваім бязлітасным сцэнарыі — на досвітку акружалі вёску, зганялі ўсіх жыхароў у адзін дом, потым выводзілі па адным да прыгатаванай ямы і расстрэльвалі. У цалкам спаленай вёсцы 87 жыхароў забіты, у тым ліку 19 дзяцей.

З успамінаў Сцепаніды Аўсейчык, якая жыла ў кіламетры ад Сіняга Каменя (зборнік «Галасы дзяцей вайны»): *«Я бачыла, як гарэла вёска. А потым чула, што фашысты выпусцілі з дома толькі сям'ю старасты. Яго стрыечны брат папрасіў старасту ўзяць да сябе свайго сына-падлетка, але той спалохаўся за сваю скуру і пакінуў пляменніка на пагібель».*

Жыхары суседніх лясных вёсак чулі стрэлы, крыкі ды плач. Яны потым хадзілі ў спаленыя вёскі і расказвалі, што зямля там была насычана крывёю і, як падавалася, пад магілай яна яшчэ варушылася. Каб пазбегнуць такой долі, многія сем'і пайшлі жыць у бліндажы ў лесе, хоць там было сыра, стаяла вада.

Гродзенскі гісторык Андрэй Вашкевіч расказаў, што каманда карнікаў выязджала ноччу альбо на досвітку. Да лета 1943 года такіх бязлітасных аперацый масавага знішчэння населеных пунктаў на Гродзеншчыне не было. Як правіла, акупанты дзейнічалі выбарачна: шукалі актывістаў супраціўлення і членаў іх сем'яў. Летам 1943 года было вырашана праводзіць так званыя масавыя «пацыфікацыі» (гвалтоўнае ўціхамірванне народнага абурэння).

Выбіраўся населены пункт, бліжэйшы ад месца нападзення партызан на нямецкіх салдат і паліцыю, альбо ад месца дыверсіі на чыгунцы. Нават у паліцыі да апошняга моманту не ведалі, якую вёску плануюць знішчыць. Такая сакрэтнасць была дзеля таго, каб паліцаі не папярэдзілі сваякоў і не сарвалі карную аперацыю. Лічыцца, што вёскі вакол Гродна былі спалены карным атрадам паліцэйскага афіцэра Мюлера, сфарміраваным у Кёнігсбергу (цяпер Калінінград). Мясцовыя прыслужнікі да моманту прыезду карнікаў збіралі падводы, каб вывезці са знішчанай вёскі маёмасць. Пазней яна прадавалася з аўкцыёну.

У наступным годзе споўніцца 80 гадоў Хатынскай трагедыі. Такую ж жалобную дату адзначаць і яе «сёстры» на Гродзеншчыне. Фашысты спалілі ў наваколлі Гродна дзесяткі вёсак. На месцы большасці з іх зараз пусткі ў лесе, дзе стаяць адна ці дзве хаты, пабудаваныя на папялішчы тымі, хто перажыў навалу. Там, дзе былі Бабіна, Шкленск, Сіні Камень, Полымя, Пузавічы стаяць абеліскі ды крыжы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота Мікалая ЛАПІНА.**

*Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.*

БЕЛАРУСБАНК

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта** | **Изолированное помещение № 130/D-60053** |
| **Месторасположение объекта** | г. Пинск, ул. Альбрехтовская, 4-103 |
| **Продавец объекта** | ОАО «АСБ Беларусбанк» |
| **Организатор торгов** | Брестское областное управление № 100 ОАО «АСБ Беларусбанк» |
| **Площадь** | 218,9 кв. м |
| **Начальная цена продажи с учетом НДС** | 135 360,00 руб. (сто тридцать пять тысяч триста шестьдесят руб. 00 коп.) |
| **Сумма задатка** | 13 536,00 руб. (тринадцать тысяч пятьсот тридцать шесть руб. 00 коп.) |
| **Информация о земельном участке** | Земельный участок с кадастровым № 144500000015000091, с площадью 0,3531 га |
| **Характеристика объекта** | Стены – кирпичные, перекрытие – железобетонные плиты; кровля – рулонная; полы – бетонные мозаичные, плитка ГРЭС; окна – деревянные, стеклопакеты ПВХ; двери – ПВХ, металлические, ДВП; внутренняя отделка – обои, штукатурка с покраской; отопление, холодное водоснабжение и канализация – централизованная система; вентиляция – естественная |
| **Условия оплаты** | По договоренности победителя аукциона с собственником имущества |

**Аукцион состоится 01 декабря 2022 года в 10.00 по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202, актовый зал на 9-м этаже.**

**Документы для участия в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202, каб. 409 до 29 ноября 2022 года.**

Для участия в аукционе к моменту подачи документов необходимо внести задаток на р/с **BY69AKBB66708597000020000000**, ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНН 100325912.

— Я рады зноў быць у Мінску. Я ўжо не першы год з'яўляюся старшынёю журы. І, акрамя фестывальнай праграмы, мяне радуе, што маю магчымасць хоць раз на год наведаць Смаленск і Мінск. Адносна фільмаў, якія ў гэтым годзе былі ў праграме, даволі яскрава прасочваецца тэма таго, якім можа быць чалавек у зменлівых абставінах. У асноўным гэта група кінастужак, якія расказваюць пра маленькіх людзей. Яны не знакамітыя, у іх простыя прафесіі (кінамеханік, фельчар і інш.). І тут галоўнае — знайсці цікавае ў звычайным чалавеку, — распавядае **старшыня журы фестывалю дэкан вышэйшай школы тэлебачання імя М. В. Ламаносава Віталь ТРАЦЦЯКОЎ.** — А калі пра палітычныя рэаліі казаць, то праграма фестывалю стваралася яшчэ да падзей на Украіне. Там знайшлі адлюстраванне юбілейныя даты, актуальныя падзеі палітычнага парадку дня, тэма ВАВ у многіх, у прыватнасці беларускіх, фільмах. І калі б заходнія журналісты паглядзелі гэтыя фільмы, то яны б убачылі, як неанацызм, у якім расійскія ўлады абвінавачваюць украінскі рэжым, не толькі тады быў рэальнасцю, але і сёння існуе ў тым жа выглядзе. Таму, калі фільмы, прадстаўленыя на фестывалі, тая ж моладзь паглядзіць нават без каментарыяў аўтараў, то яна пераканаецца, што гістарычная праўда на нашым баку. Хаця, зразумела, падзеі бягучыя можна ацэньваць па-рознаму. Але я маю на ўвазе фундаментальную праўду і супрацьстаянне дабра і зла. Зло — гэта нацызм, хлусня, расізм і гэтак далей. І ў фільмах тое было паказана.

З шэрагу фільмаў, прысвечаных падзеям, якія зараз назіраем ва Украіне, напрыклад, «Данбас на лініі агню» (*2022, Расія, рэж. Алег Некішаў*), дзе праз гісторыі простых людзей паказваецца вайна і яе наступствы. І падчас прагляду становіцца балюча ад эмоцый яго герояў, бо ўсведамляеш галоўнае: за кожнай гісторыяй трагедыя, зруйнаваныя лёсы і раны, наступствы ад здзяйснення злачынства будуць гаіцца вельмі доўга. Альбо іншы фільм — «Remember Odessa. Не забудзем, не прабачым» (2022) ад нямецкага рэжысёра Вільгельма Домке-Шульца. Фільм паказвае супрацьстаянне, якое скончылася стратай соцень жыццяў... Сярод кінаработ у рамках фестывалю можна было таксама ўбачыць «Тры дні свабоды» (*2022, рэж. Дзмітрый Сарока*), «Перазвон» (*2021, рэж. Яўген Сяцько*), «Попел Хатыні. Боль без тэрміну даўнасці» (*2021, рэж. Расціслаў Смольскі*), «#ЗАЖЫВОе» (*2022, аўт. Паліна Лушчык*)...

Таналькасць зусім іншага жыцця гледачы маглі адчуць падчас прагляду кінастужак «Зямля вялікіх кошак» (*Кітай, 2021, рэж. Яўгенія Стрыгіна, Арсеній Аляўдзін, Гаа Фэн, Чэнь Ці*) — расповед пра амурскіх тыграў, «Дарога» (*Арменія, 2022, рэж. Эдгар Саркісян*), дзе паказана гісторыя трох сяброў, што жывуць у маленькай вёсцы і, нягледзячы на цяжкасці, шчаслівыя ў сваім дзяцінстве. Пералічваць можна доўга, але галоўнае ўсё ж не колькасць, а тое, з якім настроем і думкамі кожны з наведвальнікаў фестывалю пакідаў кіназалу і ці хацелася вярнуцца на іншыя сеансы. Бо, як адзначыў адзін з гасцей кінафоруму, **палітычны аналітык, палітолаг, публіцыст з Германіі Уладзімір СЕРГІЕНКА,** дакументальнае кіно — гэта фіксацыя таго, як ты жывеш сёння.

— Дакументалістыка — сур'ёзная рэч, хоць гэтае кіно і не прыбытковае, не масавае. Але там ёсць шчырая размова аўтара з гледачом. Таму дакументалістыка — гэта барацьба супраць падману культур, якая сёння адбываецца і часткай якой мы з'яўляемся... Наша праўда нікому не трэба. Нас там, на Захадзе, не чуюць, таму што ім гэта не патрэбна. Ці патрэбна яна нам? — звярнуўся да прысутных Уладзімір Уладзіміравіч. — Я лічу, што дакументальнае кіно трэба падтрымліваць у любым выпадку. І без моладзі ніяк, бо, як я адзначаў, любы блогер сёння — дакументаліст. Зараз нам трэба фіксіраваць наша жыццё. І ў дадзеным выпадку гэта атрымліваецца як судовае расследаванне, бо дакументалістыка ў наш час — доказная база злачынства тут і цяпер.

Чакаецца сёлета і вялікая постфестывальная праграма, у рамках якой да канца года пройдуць кінапаказы найлепшых фільмаў і круглыя сталы ў некаторых гарадах Беларусі і Расіі, Малдовы, Казахстана, Кыргызстана, Узбекістана. Таму сачыце за афішамі і не прапусціце адгалоскі фестывалю ў сваім горадзе.

**Алена ДРАПКО.**

# ПРА ШЛЯХ ДА ЎЗ'ЯДНАННЯ

## Стартаваў новы праект «Беларусьфільма»




**На кінастудыі «Беларусьфільм» пачаліся здымкі новага нацыянальнага праекта пад рабочай назвай «Мы адзіныя». Над стужкай працуе беларуска-расійская творчая група. Падзеі поўнаметражнага фільма адбываюцца ў 1925 годзе, калі Беларусь была падзелена на Усходнюю і Заходнюю. Галоўныя героі, браты Павел і Антон, апынаюцца ў віры гістарычных падзей: партызанская барацьба, польская акупацыя і прыгнёт. Што чакае братоў і якія выпрабаванні выпадуць на іх долю? Аб гэтым можна будзе даведацца пасля таго, як стужка пабачыць свет. А пакуль «Звязда» распавядае аб першым здымачным дні.**

Натурная пляцоўка студыі знаходзіцца пад Смалявічамі. Месца, асабліва ў восеньскія дні, выглядае сапраўды кінематаграфічна: пажоўклае лісце кантрастуе з зялёнымі галінкамі яловага лесу. Чуваць фырканне коней — жывёлы іграюць далёка не апошнюю ролю ў фільме. Згодна з сюжэтам, падзеі стужкі адбываюцца ў лістападзе. Надвор'е спрыяе задумцы сцэнарыстаў: ідзе невялікі дождж, а неба зацягнута хмарамі. На пляцоўку завітаў генеральны дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм» Уладзімір Карачэўскі:

— Спадзяёмся, што «Мы адзіныя» стане першай часткай трылогіі аб беларусах, аб тым, як мы жылі падзеленымі і як аб'ядноўвалі, адраджалі краіну. Эпоха закранута няпростая, раней кінастудыя да гэтай тэмы не звярталася. Уяўляеце, сем'і былі падзелены мяжой — яны не маглі не тое што жыць разам, але і нават сустракацца. Ішла барацьба за вызваленне тэрыторыі, якая знаходзілася пад польскімі ўладамі. З аднаго боку, гэта драматычны час, але ў ім можна знайсці элементы рамантыкі: партызаны, пагоні, кантрабандысты. У першую чаргу ў стужцы закладзена гуманная і вельмі важная ідэя: Беларусь павінна быць адзінай, а родныя людзі — разам. Тэма актуальная як ніколі: у час, калі сціраюцца паняцці патрыятызму, любові да Радзімы, трэба захоўваць свае традыцыі і культуру.

Каб дакладана адлюстраваць час, разам са стваральнікамі працуюць гістарычныя кансультанты. Захаваць гістарычную дакладнасць дапамагаюць загадчык аддзела найноўшай гісторыі Інстытута гісторыі НАН Сяргей Трацццяк, а таксама сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі, аўтар гістарычных кніг Вячаслаў Бандарэнка.

На першы дзень у каманды шмат планаў. Трэба настроіць абсталяванне, зняць пачатковыя сцэны, а пасля абавязкова разбіць талерку, каб фільм атрымаўся. Рэжысёр-пастаноўшчык Андрэй Хрулёў распавёў, што цэнтрам гісторыі стануць лёсы звычайных хлопцаў са Стоўбцаў.

— Для мяне гэта гісторыя аб тым, як у няпростых абставінах застацца чалавекам. У стужцы адлюстравана, як галоўны герой робіць выбар і якія падзеі гэтаму спрыяюць. У нас запланавана дастаткова дынамічных сцэн, звязаных з конямі. Відовішчная і масавая сцэна суда, на якім беларускія падпольшчыкі будуць вызваляць сваіх таварышаў, павінна здымацца ў Снове.



Здымачны працэс тым часам працягваецца: акцёры рэпеціруюць сцэну, спецыяльнымі ўстаноўкамі распыляецца дым, памочнікі перадаюць каманды па рацыях. Непадалёк свайго часу чакаюць грымёры, піратэхнікі і механікі — яны павінны быць побач, бо зусім хутка аператар дасць старт здымкам.

Данііл Чуп выконвае ролю Паўла. Менавіта яго герою давядзецца вырашаць, на чый бок стаць. А пакуль у акцёра ёсць некалькі хвілін, каб распавесці аб атмасферы, што пануе на пляцоўцы:

— Мой герой хоча проста жыць: працаваць, кахаць, сталець. Таму на пачатку фільма ён не зацікаўлены ў тым, што адбываецца вакол. Але абставіны ўсё ж такі вымушаюць яго пачаць дзейнічаць. Першы здымачны дзень праходзіць выдатна, пакуль не паспеў з усімі пазнаёміцца, але атмасфера ўжо сяброўская. Каскадзёры дапамагаюць справіцца з конямі — гэта вельмі важна, таму што сыграць сцэну — адно, а тэхнічна праехаць на кані — іншае.

Плануецца, што здымкі на натурных пляцоўках працягнуцца да снежня. Потым каманда пачне працаваць у павільёнах. Работа над фільмам стартавала напрыканцы мінулага года: пасля распрацоўкі сцэнарыя праводзіўся кастынг акцёраў. Адметна, што будучых выканаўцаў падбіралі згодна з гістарычнымі фотаздымкамі, каб іх тыпажы адпавядалі вобразам людзей мінулай эпохі. Прэм'ера стужкі запланавана на май 2023 года.

**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# СВЯТЛО ЯК ДОБРЫ ЗНАК,

## альбо Крыху пра любоў Івана Пташнікава





**Калі мы бяром у рукі кнігу, то не асабліва думаем пра званні і заслугі пісьменніка: трэба, каб адгукалася і было да часу. У творах Івана Пташнікава вялікая сувязь з зямлёй, з радзімай — а гэта надзвычай актуальная тэма цяпер. Так, ёсць пласт літаратуры, якая засталася ў мінулым, аднак у ёй досвед, які дапамог нашым папярэднікам выжыць у час ліхалецця, акрыяць і заставацца сабой. Аўтар аповесцяў і раманаў «Мсціжы» і «Алімпіяда» ўмеў угледзецца ў свет і ўбачыць у ім чалавека, прыслухацца да яго думак і адчуць, калі і што прывядзе да пералому, за якім — іншая якасць, плён, жыццё. Іван Пташнікаў не меў звання народнага пісьменніка, але ведаў народ, часцінкай якога быў і застанецца. У юбілейны год пісьменніка наша размова з яго дачкой Таццянай пачалася з удакладнення:**

***— Як Пташнік стаў Пташнікавым?***

— Сапраўды, ён з сям'і Пташнікаў. Пад гэтым прозвішчам быў вядомы татаў брат, які ў свой час працаваў намеснікам Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь. Але ў пасведчанні аб нараджэнні таты значацца яго бацька як Пташнікаў Мікалай Васільевіч і маці — Пташнікава Алімпіяда Лазараўна. Гэтае пасведчанне было адноўлена ў 1948 годзе. Справа ў тым, што іх вёска была спалена ў час вайны, разам з хатай былі страчаны дакументы. А сям'я ўратавалася. І ўжо пасля вайны шаснаццацігадовым юнаком тата пайшоў у пашпартны аддзел вырабляць дакументы. Яго спыталі: «Ты чыіх будзеш?» — «Пташнікавых». Так і запісалі. Паводле метрыкі, якая захоўваецца ў нас дома, ён нарадзіўся ў першай палове 1932 года, дакладная дата нам не вядомая. Мяркую, што ён сам выбраў 7 кастрычніка, паколькі лічбу «7» лічыў шчаслівай для сябе.

Тата быў чалавекам традыцыйных каштоўнасцяў, для яго вельмі шмат значыла сям'я. Асаблівую ролю ў жыцці таты адыграла яго маці. Нездарма ў яго нямала спасылак на Алімпіяду Лазараўну, вобраз якой ён выводзіў у творах. Яна была самая адукаваная жанчына ў вёсцы на той момант, у яе за плячыма — Смілавіцкі сельскагаспадарчы тэхнікум, яна працавала загадчыцай фермы. Акрамя таго, была вернiцай, у вольны час спявала на клірасе. У нас захаваўся экземпляр сямейнай Біблії, увесь з пазнакамі чырвоным алоўкам на палях, якія пакінула мая бабуля, — глыбока асэнсоўвала тое, што напісана. Натуральна, што яе дзеці вылучаліся здольнасцямі да навукі.

Наш дзядуля Мікалай Васільевіч Пташнік быў пастухом у калгасе, але хварэў на сухоты, нават меў белы білет, рана памёр ад запалення лёгкіх. Тата распавядае яго гісторыю ў «Ненапісанай аповесці» — пранізлівым аўтабіяграфічным творы, адным з апошніх, якія выйшлі ў свет. У ім адлюстравана яго дзяцінства і юнацтва, поўныя болю і нястач пасляваеннага перыяду.

***— Як вясковы хлопец выбіраў жыццёвы шлях?***

— Тата вучыўся на выдатна і быў адораны рознымі творчымі здольнасцямі. Арсень Ліс, з якім ён пасябраваў яшчэ падчас працы ў Дзяржаўным выдавецтве Беларусі, распавядаў мне, што Пташнікаў быў заядлым тэатралам, аматарам музыкі і оперы, не прапускаў прэм'ер. Сам добра спяваў — у яго быў прыгожы барытон, і ён мог стаць спеваком. А мог і акцёрам — пасля заканчэння школы імкнуўся гаварыць басам, пераймаючы Качалава. Тата распавядаў, як паступаў у Беларускі тэатральны інстытут, але заваліў экзамен па рускай мове — зразумела, што ў яго жыцці ўсё было па-беларуску. Старшыня камісіі пасля прапаноўваў яму ўсё ж застацца, бо беларускай сцэне патрэбны артысты з яркай фактурай: тата быў моцны, статны — усе Пташнікі з пароды волатаў. Але калі ён першы раз трапіў у тэатр за кулісы і паглядзеў, як ставілі вясковую п'есу ў штучных дэкарацыях, то сцэна падалася мёртвай. Яго гэта ўразіла да болю, і цікавасць да тэатра згасла.

Але творчая натура знайшла свой шлях. Стаць пісьменнікам дапамаглі прыродная фатаграфічная памяць, уважлівасць да дэталяў. У таты была ўвага да кожнай драбніцы, усё захоўвалася ў свядомасці, кожнае дзеянне мела нейкае асаблівае значэнне...

Ён ніколі не вёў дзённікаў. Але ўвесь час насіў з сабой нататнікі, куды запісваў назіранні, сюжэты, трапныя выразы. Па гэтых пісьменніцкіх кніжках, якіх у мяне захоўваецца шмат, і нават па запісах на аркушах, складзеных у некалькі разоў, відаць, як прыйшло назіранне ці нейкае слова.

Мой тата ў маладосці — адкрытая, смелая натура, ён і на фотаздымках шырока і ўпэўнена ўсміхаецца. Але па меры сталення ў яго вачах з'яўляўся сум...

***— Жыццё ў горадзе паўплывала ці іншыя прычыны?***

— У маладосці ў яго быў небяспечны досвед. Ён даволі адкрыта выказваў сваё меркаванне, часам рэзка, не ўсім гэта падабалася, а ў той час за гэта можна было пацярпець. Аднойчы нават прагаварыўся Арсеню Лісу: «Ты ўжо не бачыць мой партрэт у чорнай рамцы...» У той час трэба было думаць, што каму кажаш, бо пісалі не толькі пісьменнікі, і не толькі кнігі. Магчыма, гэта прымусіла тату пераглядзець адносіны з людзьмі, з'явілася асцярожнасць.

Шмат хто адзначае, што ён быў чалавек суровы, яго пабойваліся. Думаю, ахоўная рэакцыя: незразумела, хто перад табой. Але насамрэч ён быў вельмі кантактны, меў шмат сяброў, быў душой кампаніі, трапна жартаваў. Калі ён разумеў, што побач свае, то раскрываўся. У нас дома заўсёды было шмат гасцей.

***— Ці даводзілася хадзіць да бацькі на працу?***

— Так, ён мяне браў і ў Саюз пісьменнікаў, і ў рэдакцыю, куды хадзіў на працу ў другой палове дня — валодаў хуткачытаннем, таму ўсё паспяваў. А рэдакцыя размяшчалася побач з нашым домам, у суседнім будынку. Ён мог прыбегчы дадому і паглядзець двaіх дзяцей, таму што наша мама на працы была ўвесь дзень. А паколькі ён быў вясковы хлопец, то ўмеў усё: яны ж самі плялі лапці, касілі, секлі дровы. Ён мог прыгатаваць і зацірку, і дранікі. Тата ніякай працы не цураўся, нават калі стаў вядомым чалавекам. Калі нарадзіўся мой брат, ён сам звязаў яму пінетачкі. Да жонкі ён ставіўся з пяшчотай, мог пайсці ўночы на малочную кухню ці ў аптэку. Калі яны з мамай пазнаёміліся, ён казаў: «Ніхто, акрамя гэтай жанчыны, не пераступіць парог майго дома».

Валянціна Іванаўна была для яго галоўны крытык і першы чытач — вельмі цаніў яе меркаванне. Мама чытала таты кнігі па-беларуску, разумела. Але гэта давалася ёй няпроста, бо ўсе ведаюць, што ў Пташнікава шмат мясцовых дыялектызмаў, — «плешчанізмаў», тлумачэнне якіх не заўсёды знойдзеш у слоўніку.

Наша маці сама з Расіі, скончыла Маскоўскі дзяржаўны гісторыка-архіўны інстытут, яе размеркавалі ў Мінск, працавала ў Галоўным архіўным упраўленні пры Саўміне. Аднойчы яе з праверкай накіравалі ў «Полымя», дзе яны і пазнаёміліся.

***— А калі Пташнікаў працаваў над кнігай, як гэта адбівалася на сям'і?***

— У таты быў кабінет, ён там зачыняўся, мог працаваць начамі — калі ўсё сціхала, ён заглыбляўся ў творчы працэс. Толькі шчылінка пад дзвярыма гарэла позна ўночы. У такія перыяды я ведала: тата працуе над творам. А калі дапісваў і ставіў кропку, то ва ўсёй кватэры запальваў святло, няважна, дзень ці ноч. Яго схільнасць да сімвалізму выяўлялася не толькі ў творах, але і ў жыцці: святло было добрым знакам. А яшчэ ён пісаў у адпачынках, куды мы ездзілі сям'ёй, у дамах творчасці. Мы гулялі — а ён баяўся ўпусціць момант.

***— Як у сям'і адзначалі выхад у свет новай татавай кнігі?***

— Звычайна ён прымаў водгукі і віншаванні па тэлефоне. А калі ў 1978 годзе яму прысудзілі Дзяржаўную прэмію Беларусі імя Якуба Коласа, то дома накрылі вялікі стол, прыйшло шмат гасцей. Але нас, маленькіх, за стол не садзілі. У нас была ўласная дзіцячая праграма.

***— Як выхоўваў сваіх дзяцей пісьменнік Пташнікаў?***

— Ён быў вельмі добры, адказны, але строгі бацька. Сам быў педантычны, меў прыгожы почырк. Яму трэба было, каб усё было ідэальна. У першым класе стаяў нада мной і прымушаў перапісваць прапісі. Аднак калі ў мяне нешта доўга не атрымлівалася, то мог сесці і дапамагчы рашыць задачку па матэматыцы. Абураўся, але дапамагаў. Бывала, ён прасіў мяне прадэкламаваць вершы, якія задавалі ў школе вывучыць на памяць. А я саромелася, бо ён быў надта патрабавальны. Патрабаваў ад нас даросласці не па ўзросце. Яму хацелася, каб мы ўсё разумелі, каб разбіраліся, каб ведалі. Я была любімая дачка. Ён з задавальненнем прысвячаў мне час, вадзіў у музычную школу за ручку — гэта мела для яго асаблівы сэнс. А перад выпускным вечарам у школе вучыў мяне танчыць вальс.

***— А ці патрабаваў, каб вы чыталі?***

— Тата ніколі не настойваў, каб мы чыталі яго творы. Па прынцыпе: прыйдзе час — прачытаеце. Для мяне, падлетка, гэта не была лёгкая літаратура, у першую чаргу ў эмацыянальным плане: яна адгукалася болем, і я заўсёды плакала над трагічнымі лёсамі герояў яго твораў. Але ён сам быў вельмі начытаным, эрудзіраваным чалавекам, любіў рускую і замежную класіку, асабліва Фолкнера. У яго была выдатная памяць, ведаў безліч вершаў, мог цытаваць розных паэтаў, нават да самай смерці. Лічыў, што гэта адзіны спосаб захаваць памяць. І калі ўжо занядужаў, то прымушаў працаваць свой мозг пастаяннымі інтэлектуальнымі практыкаваннямі.

Ён моцна здаў пасля смерці жонкі. Яна сышла з жыцця ў 58 гадоў, у 1995-м. Тады яго звольнілі пасля 33 гадоў працы ў часопісе «Полымя» з-за скарачэння штату. Заставалася толькі творчасць. Менавіта з гэтага моманту ў яго нараджаюцца самыя моцныя творы малых форм — аповесці і апавяданні, якія патрабуюць вялікай канцэнтрацыі. А ўсё адно было ў яго адчуванне незапатрабаванасці. Мы дома яго займалі клопатамі пра ўнучку. Уключыўся, быў добры дзед: плянёкі прасаваў, калыхаў, даглядаў, а потым і ў дзіцячы садок і школу адводзіў. Я разумела, што яго нельга пакідаць аднаго. Нібыта адчувала... Калі здарыўся інсульт, нас дома не было. Урачы здзіўляліся, што ён выжыў. Але страціў рух, быў паралізаваны на адзін бок. З якой сілай волі ён сам трэніраваўся на спецыяльных прыстасаваннях! За год навучыўся сядаць і ўставаць. Пры гэтым ён заставаўся сябрам усіх творчых камісій, яму пісалі, запрашалі. Ён размаўляў, чытаў, выказваў сваё меркаванне, даваў рэкамендацыі і пісаў рэцэнзіі. Але больш ніводнага твора не напісаў...

Я даглядала тату адзінаццаць гадоў, ён казаў, што замяніла яму і медсястру, і ўрача, і сядзелку. Ён сам паказаў мне такі прыклад у жыцці. Нашу маму не змаглі вылечыць ад раку мозга, яна памірала дома на руках таты, вельмі цяжка, не ў прытомнасці. Я назірала за тым, як ён клапаціўся пра каханую жанчыну да апошняга моманту. Для нас гэта быў прыклад любові.

***— Ці ёсць твор бацькі, які здаецца вам асаблівым?***

— З мастацкіх твораў я цаню аповесць «Найдорф» і апавяданні. Але мне асабіста бліжэй яго аўтабіяграфічная «Ненапісаная аповесць». Там я знайшла адказы на шмат якія свае пытанні. Пры жыцці тата не быў гаваркі, казаў: «Чытай — у маіх кнігах усё напісана...»

Так і атрымалася. Для мяне яго кнігі — гэта працягнуты дыялог з бацькам, неацэнная магчымасць ведаць свой радавод, свае карані. Калі чытаю, пазнаю рысы, што дасталіся ў спадчыну. Разумею, чаму мае продкі думалі так, паступалі так і чым яны па духу блізкія мне. У бацькавай сям'і было сямёра дзяцей, двое памерлі немаўлятамі, пяцёра выжылі. Усе былі дружныя. Падтрымлівалі адзін аднаго, дапамагалі і матэрыяльна, і маральна. Тата ў пэўны перыяд быў добра забяспечаны — у дзяржавы былі спосабы заахвоціць таленавітых людзей. Як мне гаварылі, Пташнікаў быў адным з любімых пісьменнікаў Пятра Машэрава, паколькі пісаў пра партызан, на ваенную тэму.

***— На вашым жыцці гэта адбівалася?***

— Я была познім дзіцем і жыла ў сваім дзіцячым свеце, шмат чаго не разумеючы. У мяне быў горача любімы тата, а ўсведамленне падзей, асаблівасцяў эпохі, у якую ён працаваў, маштабу яго асобы і глыбіні твораў да мяне прыйшло пазней.

Ён быў горды і моцны чалавек. Але з тонкай душой...



**Ларыса ЦІМОШЫК.**

Альфа·Банк

## Закрытое акционерное общество «Альфа-Банк»

220013, Минск, ул. Сурганова, 43-47,
тел.: (017) 217-64-63, 217-64-59, факс (017) 200-59-29
Телекс 252190 ITIB BY, SWIFT ALFA BY 2X

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС по состоянию на 01.10.2022

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2022 | 2021 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 293 892 | 200 173 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 1 090 650 | 1 067 279 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 233 243 | 177 738 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 343 790 | 174 180 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 2 104 390 | 2 412 465 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 77 | 4 154 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 0 | 20 852 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 118 118 | 92 795 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 5 498 | 2 536 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 265 | 62 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 40 103 | 38 567 |
| 15 | **ИТОГО АКТИВЫ** | **11** | **4 230 026** | **4 190 801** |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | 0 | 59 758 |
| 18 | Средства банков | 1202 | 207 832 | 157 735 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 3 016 065 | 3 048 577 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 137 840 | 210 930 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 0 | 1 781 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 77 492 | 68 486 |
| 24 | **Всего обязательства** | **120** | **3 439 229** | **3 547 267** |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 70 422 | 70 419 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 129 103 | 100 000 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 54 248 | 41 318 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 537 024 | 431 797 |
| 31 | **Всего собственный капитал** | **121** | **790 797** | **643 534** |
| 32 | **ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | **12** | **4 230 026** | **4 190 801** |

Председатель Правления В.С. Смоляк

Главный бухгалтер А.В. Скрипка

Дата подписания: 05 октября 2022 г.

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ по состоянию на 01.10.2022

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2022 | 2021 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 280 097 | 236 792 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 91 026 | 50 172 |
| **3** | **Чистые процентные доходы** | **201** | **189 071** | **186 620** |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 134 513 | 112 172 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 23 036 | 16 826 |
| **6** | **Чистые комиссионные доходы** | **202** | **111 477** | **95 346** |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | -2 976 | -5 284 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 156 284 | 61 769 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 30 064 | 6 776 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 95 516 | 29 492 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 8 427 | 9 440 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 203 839 | 149 837 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 14 237 | 11 716 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 178 755 | 163 622 |
| **16** | **Расход (доход) по налогу на прибыль** | **212** | **55 602** | **46 720** |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | **123 153** | **116 902** |

Председатель Правления В.С. Смоляк

Главный бухгалтер А.В. Скрипка

Дата подписания: 05 октября 2022 г.

С отчетностью вы также можете ознакомиться на сайте: alfabank.by/about/reporting/

УНП 101541947

---

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона:** ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703

**Продавец:** ОАО «Завод «Легмаш», Витебская обл., г. Орша, Восточный переулок, 17

**Оператор ЭТП:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by

Предмет аукциона:

**Сооружение неустановленного назначения**, общ. пл. 791,9 кв. м, инв. № 00020030, адрес: г. Орша, пер. Восточный 2-й, 19А.

***Сведения о земельном участке:*** земельный участок общей площадью 0,7536 га, предоставлен продавцу для строительства и обслуживания сооружения неустановленного назначения с инв. № 00020030 на праве аренды до 31.12.2049.

Начальная цена с НДС 20 %: 358 986,64 бел. руб.

Шаг торгов составляет 5 % от текущей цены предмета аукциона

Регистрация перехода права собственности на предмет аукциона к Покупателю будет осуществляться в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 31 декабря 2018 г. № 506 «О развитии Оршанского района Витебской области». Государственная регистрация договора купли-продажи и перехода права собственности на объекты недвижимости осуществляется Покупателем самостоятельно за свой счет

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30 рабочих дней** после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов и продавцу затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере **4 %** от цены продажи лота в течение **3 дней** после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов: **08.11.2022** с **11.00** до **13.00**.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата, место и время окончания приема документов:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **04.11.2022 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

---

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Предмет торгов – Лот:**

1) капитальное строение с инвентарным номером 130/С-36864 (наименование: производственный цех; назначение: здание многофункциональное), площадью 266,3 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Крайняя, д. 26, на земельном участке с кадастровым номером 144500000023000833, площадью 0,2381 га, составные части и принадлежности: железобетонный забор, ворота из металлической сетки;

2) капитальное строение с инвентарным номером 130/С-36863 (наименование: гараж; назначение: здание специализированное автомобильного транспорта), площадью 81,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Крайняя, д. 26, на земельном участке с кадастровым номером 144500000023000833, площадью 0,2381 га, составные части и принадлежности: пеноблочный гараж, кирпичный склад, навес;

3) капитальное строение с инвентарным номером 130/С-42130 (наименование: водопроводная сеть; назначение: сооружение специализированное водохозяйственного назначения), протяженностью 65,0 м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Крайняя, д. 26, водопроводная сеть, составные части и принадлежности: трубопровод напорный, колодец камера

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (с учетом НДС)** | 58 248,00 | **Размер задатка, руб.** | 5 824,80 |

**Продавец:** ОАО «Брестторгтехника», г. Брест, ул. ГОБК, 32, тел./ф 80162 21 55 31. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, 80162 40 87 01. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 03 ноября 2022 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 02 ноября 2022 г. до 17.00**

---

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «КАМВОЛЬ», 220028, г. Минск, ул. Маяковского, 176** |

**Предмет электронных торгов: транспортные средства с пробегом**
**Месторасположение: г. Минск, ул. Маяковского, 176**

| № лота | Наименование | Инв. № | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Специальная фургон-лаборатория ГАЗ-52**, рег. знак 6697МИТ, 1990 г. в. | 4902 | 1 920,00 |
| 2 | **Грузовой бортовой тентовый MAZ 53371 029**, рег. знак АО 8310-7, 1992 г. в. | 3589 | 3 360,00 |
| 3 | **Прицеп бортовой тентовый MAZ 8926**, рег. знак 1336КВ, 01.07.1992 г. (дата принятия к бух. учету) | 3590 | 1 680,00 |
| 4 | **Прицеп тракторный 2ПТС-6**, рег. знак 0843МЮ, 01.06.1991 г. (дата принятия к бух. учету) | 3570 | 2 880,00 |
| 5 | **Прицеп тракторный ПСЕ-Ф-12,5Б**, рег. знак 1350МЮ, 1998 г. в. | 4839 | 1 320,00 |
| 6 | **Трактор МТЗ-80**, рег. знак 2274МЮ, 1991 г. в. | 3611 | 6 480,00 |
| 7 | **Трактор МТЗ-82**, рег. знак 2272МЮ, 1992 г. в. | 3582 | 4 920,00 |
| 8 | **Автопогрузчик 40814**, 01.06.1990 (дата принятия к бух. учету) | 3562 | 4 680,00 |

Шаг аукциона составляет 5 % от предыдущей названной цены по всем лотам

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**Аукцион состоится 08.11.2022 в 13.00**
по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.
Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 03.11.2022 до 17.00** по указанному адресу

**Тел.: +375 17 280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

---

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Табаквинторг» (продавец) извещает о проведении **9 ноября 2022 года** открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

**ЛОТ № 1:** Изолированное помещение с инв. № 300/D-678 площадью 960,7 кв. м, назначение – Торговое помещение, наименование – торговое помещение, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 340100000001000921, площадь 0,1871 га (доля в праве 37/250); назначение – Земельный участок для эксплуатации и обслуживания многоквартирных жилых домов, встроенных изолированных помещений, не относящихся к жилищному фонду.
**Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Привокзальная, 2 А-109

**Начальная цена** с учетом НДС: **2 223 600,00** бел. руб.
**Задаток (5 %)** с учетом НДС: **111 180,00** бел. руб.

